

БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК І ПРОПІСІ ІЕРОГЛІФАЎ 8

МУЗЫКА НА КАНЧЫКАХ ПАЛЬЦАЎ 12





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 САКАВІКА 2024 г. СУБОТА № 54 (30188)


## КОРАТКА

- **Знешні доўг Беларусі ў 2023 годзе знізіўся на $2,9 млрд.**
- Больш за 17,5 тысячы эндапратэзаў суставаў будзе імплантавана ў Беларусі ў 2024 годзе.
- **Новыя 240-тонныя БелАЗы прыступілі да работы на кар'еры Курскай магнітнай анамаліі.**
- Лячэбна-прафілактычны комплекс, саляны пакой: Васілішкаўскі дом-інтэрнат стане пансіянатам.
- **Мінфін размясціў на БВФБ валютныя дзяржаблігацыі на $30 млн.**
- Беларусь плануе пастаўляць у Манголію камунальную і пасажырскую тэхніку.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ САМІ СТВАРАЛІ СВАЮ ГІСТОРЫЮ. СВАЮ КАНСТЫТУЦЫЮ ТАКСАМА ПІСАЛІ САМІ. ЯК ТАДЫ ЎМЕЛІ І ЯК РАЗУМЕЕМ ЦЯПЕР»

### 30-годдзе Асноўнага Закона — нагода для аналізу зробленага і планаў на будучыню



Фота БелТА.

**Адна з ключавых дат у найвышэйшай гісторыі Беларусі — 15 сакавіка 1994 года, дзень прыняцця Канстытуцыі. Падобных дакументаў у гісторыі краіны было некалькі, але 30 гадоў назад Асноўны Закон упершыню зацвердзіў статус Беларусі як суверэннай, незалежнай дзяржавы. Канстытуцыя, як і ўся краіна, пастаянна развіваецца і ўдасканальваецца, і 30-годдзе галоўнага закона краіны — выдатная нагода, каб прааналізаваць гэты шлях і акрэсліць перспектыву. Гэтаму была прысвечана сустрэча ў Палацы Незалежнасці, якая прайшла з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. На мерапрыемства быў запрошаны шырокі склад удзельнікаў: вышэйшыя службовыя асобы, суддзі Канстытуцыйнага Суда, члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта і іншых дзяржаўных органаў, палітычных партый і грамадскіх арганізацый, дзяржаўныя дзеячы.**

На пачатку мерапрыемства Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што падобная сустрэча ў Дзень Канстытуцыі — нагода пагаварыць аб сур'ёзных рэчах і ў той жа час аддаць даніну павагі галоўнаму дакументу нашай краіны.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што кожны з прысутных у розныя гады прама ці ўскосна ўдзельнічаў у распрацоўцы і ўдасканаленні першай і адзінай Канстытуцыі суверэннай Рэспублікі Беларусь, укараненні яе палажэнняў ва ўсе галіны дзяржаўнага і грамадскага жыцця. «За намі тысячы і тысячы людзей, такіх самых актыўных удзельнікаў працэсу. Разам з Асноўным Законам мы, пакаленне сучасных беларусаў, увайшлі ў гісторыю. Гісторыю станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці. Але ў той жа час мы разумеем, што наш Асноўны Закон нарадзіўся не на бясплоднай глебе, — адзначыў беларускі лідар. — Вы ведаеце, як беражліва я стаўлюся да пераемнасці. Я заўсёды казаў, што без традыцый няма нацыі, няма дзяржавы. Гэта пытанне бесперапыннасці гісторыі народа і захавання культурнага кода. Скажу яшчэ больш канкрэтна: гэта пытанне нашай сакральнай сувязі з папярэднімі пакаленнямі і тымі, хто прыйдзе пасля нас».

### НАША КАНСТЫТУЦЫЯ ЎВАСАБЛЯЕ Ў САБЕ ДАСЯГНЕННІ МНОГІХ ЭПОХ

Як зазначыў Аляксандр Лукашэнка, няхай Беларусь і маладая дзяржава, але беларусы — сталая нацыя. Аспрэчыць гэты статус немагчыма. Як і тое, што наша Канстытуцыя ўвасабляе ў сабе дасягненні многіх эпох.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана ЮРКЕВІЧ, генеральны дырэктар РУП «Белпошта»:**

*«Кіраванне якасцю ў РУП «Белпошта» мае сістэмны падыход. Так, кантралюецца выкананне тэрмінаў перасылкі ўнутраных адпраўленняў. Заканадаўча ўстаноўлена, што для 95 працэнтаў адпраўленняў тэрміны павінны быць выкананы. Пры гэтым прадпрыемства імкнецца пастаянна паляпшаць паказчыкі, таму ў Год якасці ўзяты мэты на 100 працэнтаў выканаць гэтыя паказчыкі. Рэгламентаваны і мэтавыя значэнні часавых паказчыкаў аказання паслуг у аддзяленнях паштовай сувязі па даных аўтаматызаваных сістэм кіравання патокамі кліентаў: час чакання карыстальніка ў чарзе — не больш за 5,3 хвіліны, час абслугоўвання — не больш за 3,2 хвіліны».*

Компас

# НА ТОЙ БОК ПРАХАДНОЙ

### Навошта турысты едуць на завод?

**Паўдзельнічаць у зборцы трактара на галоўным канвееры, паглядзець, як робіцца шакалад, прадэгуставаць цукеркі, квас і іншыя напоі, прайсці пасвячэнне ў нафтавікі, абавязковым атрыбутам чаго з'яўляецца рытуал «памазання нафтай», — усё гэта сёння рэальна. Прамысловы турызм імкліва развіваецца ў нашай краіне, і адпаведныя захады робяцца як з боку дзяржавы, так і з боку саміх прадпрыемстваў, якія ўвасабляюць шэраг амбіцыйных задум. Каля 130 беларускіх вытворцаў ужо адкрылі свае дзверы для ўсіх ахвотных. Летась іх наведала звыш 200 тысяч турыстаў.**




СТАР. 7

Падзея

# «ШЧЫРА ГАНАРУСЯ, ШТО Я — БЕЛАРУСКА»

### Узнагародзілі пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года»

**У сталіцы падвялі вынікі XVI Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2023». Сярод пераможцаў — выкладчыкі і педагогі, медыкі, сацыяльныя і банкаўскія работнікі, балетмайстар і мастацкі кіраўнік тэатра, аператар машыннага даення і жанчыны ў пагонах, кіраўнікі і шматдзетныя маці. Усіх іх аб'ядноўвае актыўная грамадзянская і жыццёвая пазіцыя.**



**На ўрачыстай цырымоніі названы пераможцы ў намінацыях «Паспяховы кіраўнік», «Актыўная грамадзянская пазіцыя», «Сэрца аддаю людзям», «Матчына слава», «Гаспадыня вёскі», «Духоўнасць і культура» і «Не старэюць душой ветэраны». Акрамя таго, вызначаны найлепшыя ў спецыяльных намінацыях «За мужнасць і волю да жыцця», «За вернасць і адданасць саюзу жанчын», «Гонар маці — гонар краіны». Пераможцай апошняй, дарэчы, стала Валянціна Эдуардаўна Навіцкая, маці беларускага касманаўта Алега Навіцкага.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

24054

9 771990 763008


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2024 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «МЫ САМІ СТВАРАЛІ САВЮ ГІСТОРЫЮ. САВЮ КАНСТЫТУЦЫЮ ТАКСАМА ПІСАЛІ САМІ. ЯК ТАДЫ ЎМЕЛІ І ЯК РАЗУМЕЕМ ЦЯПЕР»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Сёння вельмі важна не толькі ведаць, разумець, але і дакладна агучваць гістарычныя факты, якія з'яўляюцца часткай нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Увесь час паўтараць як для сябе, так і для тых, хто ідзе за намі. Такіх фактаў шмат, і ўсе яны важныя», — канстатаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка згадаў статуты ВКЛ, якія, хоць і былі прагрэсіўнымі для свайго часу, па факце адлюстроўвалі інтарэсы выключна багатых і знатных людзей, што яшчэ больш павялічыла сацыяльную няроўнасць. У Канстытуцыі Рэчы Паспалітай гарантыям правоў нашага народа ў прынцыпе не знайшлося месца. І перыяд знаходжання нашых зямель у складзе Расійскай імперыі таксама не пакінуў сур'ёзнага следу ў беларускай прававой традыцыі.

«Таму важна памятаць, што ідэйна і канцэптуальна Канстытуцыя суверэннай Беларусі з'яўляецца пераемнікам Канстытуцыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі — рэвалюцыйнага, прагрэсіўнага і, галоўнае, справядлівага дакумента. Тады, у 1919 годзе, упершыню ў сусветнай гісторыі прыродныя багацці роднай зямлі былі прызнаны здабыткам усяго народа. Менавіта савецкая Канстытуцыя, таксама ўпершыню ў гісторыі, аб'явіла па-за законам эксплуатацыю чалавека чалавекам і тым самым паставіла пад абарону жыццё і годнасць людзей незалежна ад этнічнага паходжання, сацыяльнага статусу і веравызнання. Гэта і ёсць прынцып сацыяльнай справядлівасці, які быў падтрыманы ўсімі савецкімі канстытуцыямі, які і мы захавалі як асноватворны ў сваім жыцці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кажучы аб Канстытуцыі 1994 года, прынятай Вярхоўным Саветам, ён згадаў запазычанне досведу перадавых краін свету. «Памятаеце, тады мы ўвогуле беглі за перадавымі краінамі свету, капіруючы іх. Праз некалькі дзясяткаў гадоў мы зразумелі, што і не трэба было бегчы за імі. Мы ўбачылі сапраўднае аблічча гэтых краін. Іх сапраўдную дэмакратыю. І толькі сляпы гэтага не бачыць», — заўважыў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што тады найважнейшыя атрыбуты дэмакратычнага ладу, такія як падзел уладаў, законнасць у дзейнасці дзяржаўных органаў, дадатковыя гарантыі рэалізацыі правоў і свабод чалавека, — усё адлюстравалі ў тэксце Канстытуцыі таго часу. Для кантролю канстытуцыйнасці нарматыўных актаў стварылі Канстытуцыйны Суд. Зрабілі абарону канстытуцыйнага парадку найважнейшым элементам палітычнай сістэмы. Прытрымліваючыся Асноўнага Закона, практычна з нуля выбудавалі збалансаваную і эфектыўную вертыкаль кіравання. «Не адразу. Не без эмоцый. І не без спроб замежных «памочнікаў» узяць працэс пад свой кантроль», — згадаў кіраўнік дзяржавы.

## УСЕ КАНСТЫТУЦЫЙНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ ІШЛІ АД ЖЫЦЦЯ

«Успамінаючы той перыяд, я чарговы раз дзякую народу, — сказаў Прэзідэнт. — Народу, які паверыў нам, рамантыкам, падтрымаў на выбарах і рэферэндумах. І ў выніку спыніў падрыхтаваны для нас сцэнарый пермантентнага знішчэння нацыі і нацыянальнай дзяржаўнасці». Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў прынятых народам рашэннях адбілася ўся сутнасць гістарычнага моманту, які ахапіў трэць стагоддзя. У гэтым ходзе падзей выявілася і сутнасць нацыянальнага характару беларусаў — разважлівых, адказных, дальнабачных.

«З пазіцыі сённяшняга дня, азіраючыся назад, я хачу спытаць: у чым мы не мелі рацыі, прымаючы ў сваё жыццё перадавы вопыт канстытуцыйнага будаўніцтва і праламляючы яго праз вопыт, гістарычна пройдзены нашымі продкамі? І што мы зрабілі не так, абараняючы сваі гісторыю, каштоўнасці, традыцыі? Сваю гістарычную памяць? Бо, калі правесці паралелі, убачым, што ўсе канстытуцыйныя пераўтварэнні ішлі ад жыцця, былі прадыктаваны часам. Мы заўсёды раіліся з людзьмі. І на кінутыя краіне выклікі народ адказваў, выходзячы на рэферэндумы, галасуючы на выбарах. Адказваў абсалютнай большасцю галасоў. І выконваючы закон. Усё больш чым дэмакратычна», — сказаў беларускі лідар. А ў той час, паводле яго слоў, ангажаваныя палітыкі навязвалі грамадству схему сістэмнага хаосу і фактычнага безладдзя — форму парламенцкай рэспублікі. Але народ зрабіў выбар на карысць моцнай улады.

«Нас спрабавалі падзяліць па моўным і этнічным прынцыпе, але беларусы выступілі адзіным народам у падтрымку дзяржаўнага статусу дзвюх родных для нас моў. Нас хацелі адрэзаць ад каранёў, дыскрэдытуючы савецкае мінулае, але людзі, разумеючы, што з'яўляюцца спадкаемцамі гераічнага пакалення пераможцаў, вярнуліся да сімвалаў вялікай эпохі. У якія толькі саюзы ні цягнулі Беларусь, каб разарваць дружалюбныя і цесныя інтэграцыйныя сувязі найперш з Расіяй, але народ не дазволіў. А дзе цяпер тыя, хто адарваўся ад усходнеславянскай сям'і? Дзе гэтыя народы? — выказаўся кіраўнік дзяржавы. — Мы самі стваралі сваю гісторыю. Сваю Канстытуцыю таксама пісалі самі. Як тады ўмелі і як разумеем цяпер. Таму і жывём трэць стагоддзя пад інфармацыйным, палітычным, эканамічным прэсам».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ўвесь гэты час за кардонам толькі лянівы не называў Лукашэнку дыктатарам і аўтарытарным кіраўніком. «Няхай называюць. Важна тое, што мы ў выніку маем: нераспрададзеныя народныя багацці, захаваны суверэнітэт, бяспеку і мір на роднай зямлі, рост дабрабыту нашых грамадзян. Мір, спакой і цішыню для людзей», — адказаў на нападкі кіраўнік дзяржавы.

## МЫ ВЫКАНАЛІ ЎСЁ, ШТО АБЯЦАЛІ 30 ГАДОЎ ТАМУ

Па словах беларускага лідара, цяпер, удасканальваючы Асноўны Закон у 2021-2022 гадах, мы таксама адказвалі на выклікі часу. Людзі ўбачылі, што ўзрaслі рызыкі страты інстытута традыцыйнай сям'і, нашых маральных установак, гістарычнай памяці, і паставілі гэтыя каштоўнасці пад абарону на высокім узроўні — узроўні Асноўнага Закона.

«Зразумела, што мала прапісаць у прававых навелах гарантыі, адказнасць, паўнамоцтвы і гэтак далей. Трэба зрабіць іх рэальнай практыкай. Мы робім усё, каб, што было абяцана 30 гадоў таму, выканаць. Бо ёсць з каго спытаць і каму адказаць, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мы канстытуцыйна замацавалі права кожнага на годны ўзровень жыцця. І гэта не дэкларацыі, а наша рэальная палітыка і рэальныя дасягненні».

Прэзідэнт прывёў канкрэтныя лічбы і факты. І параіў высновы рабіць самім. За тры дзесяцігоддзі грашовыя даходы насельніцтва выраслі больш як у 9 разоў (у параўнанні з сярэдзінай 90-х), а заработная плата — у 12 разоў. «Вы памятаеце, якая гіперінфляцыя была ў нас пасля развалу Савецкага Саюза. Сёння яе ўзровень не перавышае 6 працэнтаў», — падкрэсліў ён. Расце забяспечанасць грамадзян жыллём: колькасць квадратных метраў у разліку на аднаго жыхара павялічылася ў 1,6 раза. У Беларусі адзін з самых нізкіх узроўняў беднасці насельніцтва. «Я ўвогуле не ўяўляю, якая беднасць. Сёння хочаш зарабіць — рабі на трох работах. Сёння мы не кажам аб беспрацоўі, мы сёння кажам аб дэфіцыце рабочай сілы. Калі нават гэтымі паказчыкамі вымяраць наша жыццё, беднасць і гэтак далей, яна самая нізкая. Не толькі сярод краін СНД, але і сярод дзяржаў Еўрапейскага саюза. З пачатку 90-х мы ў 19 разоў паменшылі гэты паказчык. Значна знізілі ўзровень беспрацоўя. Мы адносімся да краін з высокім узроўнем чалавечага развіцця. Беларусы прызнаны высокаінтэлектуальнай нацыяй. Усё гэта даныя не нашы, а іх, нашых нядобразычліўцаў», — сказаў Прэзідэнт. Ён прагянуў: у Беларусі рацыянальна інвестуюць у інавацыі і тэхналогіі будучыні, тым самым павышаючы канкурэнтаздольнасць беларускай эканомікі. Пабудавалі Беларускую атамную электрастанцыю, паспяхова завяршылі першы этап будаўніцтва Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі. Асвоілі і масава выпускаем новую прадукцыю: легкавыя аўтамабілі, электробусы і электрацягнікі, беспілотныя кар'ерныя самазвалы. Будуем і пастаянна ўводзім у эксплуатацыю новыя лініі метро.

«Мы рацыянальныя ў фінансавых пытаннях, не дазваляем назапашваць і перакладаць свае даўгі на будучыя пакаленні. Наш дзяржаўны доўг не перавышае 32 працэнтаў ВУП. Не сакрэт, што ў шэрагу высокаразвітых краін гэты паказчык у разы вышэйшы», — прывёў яшчэ адзін прыклад Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі створаны сучасны высокапрадукцыйны аграрны сектар. Увайшлі ў топ-5 экспарцёраў малочных прадуктаў і знаходзімся ў ліку сусветных лідараў па вытворчасці мяса на душу насельніцтва. І ў цэлым экспартуем амаль 65 працэнтаў беларускай прамысловай прадукцыі.

Па словах кіраўніка дзяржавы, беларусы зразумелі, што такое дэмакратыя: «Мы памятаем, што значыць быць «дэмакратычнай» краінай у вачах Захаду. Гэта значыць быць, як у пачатку 90-х, слабымі, беднымі, прыніжанымі. Потым бегаць, як некаторыя нашы суседзі, па плошчах і вуліцах, змяняючы ўладу як пальчаткі, жыць па адмашцы з Вашынгтона... І калі выбіраць паміж добразычлівасцю заходнееўрапейскіх палітыкаў і якасцю жыцця беларусаў, нашай нацыянальнай годнасцю і суверэнітэтам, то выбар відавочны».

## ЦЯПЕР СПРАВА ЗА НОВЫМІ ПАКАЛЕННЯМІ

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, наша Канстытуцыя дае магчымасць годна жыць, развівацца, адчуваць сябе ў бяспецы, рэалізаваць самыя смелыя планы і пачынанні на роднай зямлі. «Так і павінна быць у сучаснай па-сапраўднаму дэмакратычнай краіне, — падкрэсліў ён. — І галоўнае — мы зрабілі ўсё, каб нашы дзеці змаглі перасягнуць гэтыя дасягненні і поспехі. Будзем дапамагаць і далей. Цяпер справа за новымі пакаленнямі. Скажу больш. Нягледзячы на сённяшнія цяжкасці і ўсе перыпетыі, у мяне ёсць важкія падставы ўпэўнена глядзець у будучыню. Усяляе гэтую ўпэўненасць наша дружная праца над апошнімі канстытуцыйнымі зменамі, наша нядаўняя актыўная выбарчая кампанія, наша разумнае ўспрыманне сусветных палітычных узрушэнняў і ваенных канфліктаў».

Аляксандр Лукашэнка накіроўвае на тое, што трэба працягваць больш прадметную размову аб новых задачах, якія ставіць перад намі час. Так ці інакш усе яны датычацца пытанняў захавання нашых каштоўнасцяў, культурных і духоўных прыярытэтаў, вызначэння мэт развіцця дзяржавы ва ўмовах новых геапалітычных рызык. Яны немалыя, пра гэта шмат гаворыцца.

«Мы зробім гэта падчас Усебеларускага народнага сходу, сфарміраванага ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Словам, спраў у нас шмат», — канстатаваў Прэзідэнт, але ў святочны дзень прапанаваў тым, хто прычыніўся да стварэння Асноўнага Закона, выказацца, ацаніўшы пройдзены шлях, падзяліўшыся бачаннем будучыні краіны.

Сустрэча, якая працягвалася каля дзвюх гадзін, атрымалася эфектыўнай і насычанай. Удзельнікі мерапрыемства выказалі розныя погляды на асаблівасці беларускага канстытуцыйнага ладу, падзяліліся сваімі меркаваннямі і ўнеслі прапановы.

## ПЕРАЕМНАСЦЬ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ — ЗАЛОГ УСТОЙЛІВАСЦІ І БЯСПЕКІ ДЗЯРЖАВЫ

Старшыня Канстытуцыйнага Суда Пётр Міклашэвіч звярнуў асобную ўвагу на важнасць прыняцця абноўленай Канстытуцыі на рэспубліканскім рэферэндуме ў 2022 годзе. «Можна з упэўненасцю канстатаваць, што змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю грунтуюцца на нацыянальных канстытуцыйна-прававых традыцыях, існуючай сістэме каштоўнасцяў, гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыне, улічваюць насельніцтва аб'ектыўныя патрэбы грамадства, адпавядаюць стратэгічным мэтам і задачам дзяржавы. У сучасных умовах пераемнасць канстытуцыйнага развіцця — залог устойлівасці і бяспекі дзяржавы, захавання нацыянальных традыцыйных каштоўнасцяў і самабытнасці беларускага народа», — адзначыў Пётр Міклашэвіч. Па яго меркаванні, цяпер неабходна працягваць канстытуцыйнае развіццё.

Старшыня Канстытуцыйнага Суда ўручыў Прэзідэнту падарункавы экзэмпляр Навукова-практычнага каментара да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Гэты дакумент падрыхтаваны ў мэтах выканання даручэння Прэзідэнта ад 1 красавіка 2022 года для тлумачэння канстытуцыйна-прававога сэнсу і зместу канстытуцыйных прынцыпаў і норм, правільнага разумення і няўхільнага захавання Канстытуцыі.

## КОЖНЫ ГРАМАДЗЯНІН АБАВЯЗАНЫ АБАРАНЯЦЬ СВАІМІ СПРАВАМІ АСНОЎНЫ ЗАКОН

Міхаіл Мясніковіч, у 2015—2019 гадах Старшыня Савета Рэспублікі, адзначыў важнасць канстытуцыйных рэформ: «Менавіта дзякуючы ўнясенню ў Канстытуцыю паправак, ініцыяваных Прэзідэнтам восенню 1996 года, удалося захаваць грамадзянскі мір у краіне. Беларусь адзіная на постсацыялістычнай (не толькі постсавецкай) прасторы дзяржава, якая не прымяніла ўзброеныя сілы ва ўрэгуляванні палітычнага супрацьстаяння. У той перыяд даводзілася здымаць не толькі ўнутраныя палітычныя і эканамічныя праблемы, але і адбіваць замахі на суверэнітэт Беларусі. Нягледзячы ні на што, дзяржаўнасць Рэспублікі Беларусь не толькі захавана, але і ўмацавалася, як і прадугледжана Канстытуцыяй. Гэта яшчэ адзін базавы пастулат. Мне ўяўляецца, што мы мала аб гэтым гаворым. Наша дзяржава адбылася як дэмакратычная, сацыяльная, прававая. А некаторыя новыя дзяржавы на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў так і не змаглі забяспечыць поўныя незалежнасць і суверэнітэт і ліквідаваць сур'ёзныя ўнутраныя грамадзянскія рознагалоссі».

Спікер звярнуў увагу, што ў артыкулах 11 і 12 нашай Канстытуцыі замацоўваюцца правы і абавязкі замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь нароўні з грамадзянамі Беларусі. «Добрая норма. Трэба паглядзець, наколькі дастаткова заканадаўча ўрэгуляваны асаблівасці паводзін мігрантаў. Мы бачым, што ў шэрагу дзяржаў, у тым ліку нам дружалюбных, ёсць праблемы ў гэтым пытанні», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Рэзюмуючы, ён звярнуў увагу, што Канстытуцыя стварае прававы каркас Рэспублікі Беларусь, абараняе грамадзян, грамадства, арганізацыі, дзяржаву ў цэлым. «Але і кожны грамадзянін абавязаны абараняць сваімі справамі Асноўны



Фота БелТА.

Закон, што і запісана ў артыкуле 21 Канстытуцыі і іншых прававых актах», — канстатаваў ён.

## НАША ГРАМАДСТВА ПАСТАЛЕЛА

У сваім выступленні генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі палітолаг Вадзім Гігін звярнуў увагу, што яшчэ да нядаўняга часу ў нашай краіне амаль не была сфарміравана ідэалогія. Часткова гэта было звязана з аб'ектыўнымі прычынамі: дзяржава выбірала шляхі свайго развіцця. «Аднак вострая фаза барацьбы за суверэнітэт, якая адбылася ў 2020 годзе, многае зрабіла больш выразным, ясным і зразумелым», — заўважыў ён. Па словах Вадзіма Гігіна, беларускае грамадства пасталела, стала больш мужным і гатова да ўспрымання афармленай ідэалагічнай канцэпцыі. «Больш за тое, людзі гэта патрабуюць ад нас. Падобныя патрабаванні гучалі і ў ходзе абмеркавання змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, і ў ходзе цяперашняй выбарчай кампаніі. Паверце, нашых грамадзян хвалююць не толькі пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі і цэны ў крамах, хаця і гэта таксама важна. Людзі хочуць ведаць адказ на пытанне, якое грамадства мы будуем, ведаць мэты і задачы развіцця дзяржавы», — сказаў ён. Па словах эксперта, вялікая работа ўжо праведзена, асабліва ў сферы гістарычнай палітыкі. «Год народнага адзінства, Год гістарычнай памяці, заснаванне свята народнага адзінства, стварэнне Савета па гістарычнай палітыцы, расследаванне справы аб генацыдзе беларускага народа, увядзенне курса гісторыі беларускай дзяржаўнасці — усё гэта стала вельмі магутнымі крокамі менавіта ідэалагічнага характару, — пералічыў эксперт. — Мы можам меркаваць аб гэтым па, мякка кажучы, нервовай рэакцыі нашых праціўнікаў. Яны прапусцілі гэты ўдар і цяпер спрабуюць нагнаць упушчанае. Упэўнены, што ў іх нічога не атрымаецца».

## КАНСТЫТУЦЫЯ ВЫТРЫМАЛА ВЫПРАБАВАННІ ЧАСАМ

Доктар педагагічных навук прафесар Аляксандр Радзькоў падзяліўся сваім меркаваннем наконт ролі Прэзідэнта ў пытаннях дзяржаўнага і грамадскага развіцця. Ён разгледзеў гэту тэму па аналогіі з навукай, дзе для важных адкрыццяў і эфектыўнай дзейнасці неабходны кіраўнік, надзелены прыроднай інтуіцыяй і сілай волі вучонага. Гэта задача архіскладаная. Але ў жыцці яна яшчэ складанейшая. «На пачатку дзевяностых Аляксандр Рыгоравіч адчуў, якой павінна быць наша краіна, якімі павінны быць асноўныя вектары развіцця нашага грамадства, як павінен выглядаць і працаваць Асноўны Закон нашага жыцця. Ён як навуковы кіраўнік арганізаваў работу над Канстытуцыяй — і яна вытрымала выпрабаванні часам, дазволіла краіне інтэнсіўна развівацца і выстаяць, захаваць незалежнасць і суверэнітэт у наймагутнейшых геапалітычных бурах, якія скаланаюць нашу планету ўсе гэтыя гады», — нагадаў Аляксандр Радзькоў. «Сфарміравалася дзяржава, адужэла эканоміка, вырабляецца з запасам харчаванне, развіваецца экспарт, забяспечана абараназдольнасць. Адчулі сваю значнасць, адказнасць за краіну і яе будучыню людзі. Значыць, іх можна прыцягваць да вырашэння не толькі мясцовых, рэгіянальных праблем, але і маштабных дзяржаўных задач. Трэба канстытуцыйна ўзаконіць Усебеларускі народны сход, пановаму адрэгуляваць баланс галін улады, але ў той жа час абавязкова захаваць тое, што людзі безумоўна прынялі і падтрымліваюць: моцную прэзідэнцкую ўладу, суверэнітэт краіны, шматвектарную знешнюю палітыку, даступныя для кожнага чалавека адукацыю і медыцыну», — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў. Ён выказаў меркаванне аб неабходнасці далейшага выкарыстання напрацаванага вопыту Канстытуцыйнай камісіі і рабочай групы для ацэнкі працаздольнасці аксіяматыкі нашага жыцця ў выглядзе дзейнай Канстытуцыі, асэнсавання яе будучага ўдасканалення.

## ПАКАЗЧЫК СТАЛАСЦІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ — АДЗІНАЯ СТРАТЭГІЯ

Старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» і Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Алег Раманаў пералічыў пытанні, якім на цяперашнім гістарычным этапе неабходна ўдзяліць увагу. «Паказчыкам узрослай сталасці беларускай грамадзянскай супольнасці з'яўляюцца выпрацоўка і рэалізацыя адзінай стратэгіі ў падтрымцы канструктыўнымі сіламі палітычнага курсу дзяржавы. А таксама павышэнне грамадскай самасвядомасці і грамадзянскай актыўнасці насельніцтва. Прыкладам выступае беларуская «Вялікая дзявятка» — чатыры палітычныя партыі і пяць грамадскіх аб'яднанняў, кансалідаваныя ў рамках штаба патрыятычных сіл», — растлумачыў ён.

Таксама, па словах Алега Раманава, трэба пашырыць поле дзейнасці суб'ектаў грамадзянскай супольнасці з мэтай максімальна поўнага ахопу ўсяго комплексу пытанняў, якія хвалююць людзей. Старшыня партыі «Белая Русь» заўважыў, што сёння неабходна ўдзяліць большую ўвагу вырашэнню лакальных праблем на мясцовым узроўні, знаходзіць тыя нішы, якія не толькі хвалююць грамадзян у рэгіёнах, але і могуць выклікаць пэўнае сацыяльнае напружанне.

Па словах Алега Раманава, эфектыўнае функцыянаванне грамадзянскай супольнасці сёння немагчыма без правільнага пазіцыянавання яго суб'ектаў у інфармацыйнай прасторы з абавязковым выкарыстаннем сучасных тэхналогій.

«Вопыт Беларусі паказвае: плюралізм меркаванняў карысны і бяспечны толькі пры ўмове дасягнення народнай згоды па ключавых пытаннях палітычнага жыцця. Для нас такой фундаментальнай асновай з'яўляюцца каштоўнасць незалежнай, моцнай, квітнеючай Беларусі і ідэя пабудовы сацыяльна справядлівага грамадства на аснове традыцыйных каштоўнасцяў і моцнай дзяржаўнай улады. Давер народа да Прэзідэнта дае магчымасць паспяхова пераадольваць і разам вырашаць праблемы сацыяльна-эканамічнага і духоўна-культурнага развіцця краіны, а грамадзянскай супольнасці дае дакладныя арыенціры яго развіцця», — канстатаваў спікер.

## МОЛАДЗЬ АДКРЫТАЯ ДА ЎЛАДЫ

Гаворачы аб ролі моладзі ў захаванні і памнажэнні традыцый беларускай дзяржавы, дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Бажэна Ярэміч заўважыла, што сёння ў маладзёжным асяроддзі расце цікавасць да ўсяго беларускага. «Калі маладыя людзі гэтага хочуць, значыць, трэба даць магчымасць гэта рабіць і ўсвядомлена выкарыстоўваць. Гэта значыць аналізаваць абстаноўку і даваць моладзі тое, што ёй цікава, але з дзяржаўным ухілам», — падкрэсліла яна.

Асобна Бажэна Ярэміч звярнула ўвагу на тое, што сёння ў органах улады актыўна прадстаўлены маладыя людзі. Сёлета ў мясцовыя Саветы абрана 399 прадстаўнікоў маладога пакалення Беларусі. «Мяркую, што пляцоўкі мясцовых органаў улады трэба выкарыстоўваць для навучання моладзі навыкам кіравання дзяржаўнымі справамі. Як абраны дэпутат Мінгарсавета хачу адзначыць, што маладыя людзі адкрытыя да ўлады. Галоўнае — ісці да іх, слухаць і казаць сапраўды аб тым, што мы можам для іх зрабіць. Менавіта ў гэтым будзе праяўляцца сапраўдны дэмакратызм нашай Канстытуцыі і за кошт гэтага будуць рэалізоўвацца пастаўленыя вамі задачы», — сказала яна. Своеасаблівай школай жыцця для моладзі дэпутат назвала Усебеларускі народны сход, які акумулюе ўсе слаі беларускага грамадства.

## ТРЭБА ІСЦІ АД ЖЫЦЦЯ. ГЭТА НАЙВАЖНЕЙШЫ ПРЫНЦЫП

***Падводзячы вынікі сустрэчы, Аляксандр Лукашэнка расставіў шэраг акцэнтаў па найважнейшых пытаннях, якія ўздымаліся падчас мерапрыемства.***

«Яшчэ раз паўтараю: мы павінны акуратна выбудаваць сістэму не пераходу ўлады ад Лукашэнкі да Пятрова, Сідарава... Не. Пераходу да ўлады новага пакалення. Людзі, якія тут сядзяць, — гэта новыя людзі. Фактычна ва ўладзе і кіраўнікі партый, і дэпутаты, і маладыя дэпутаты — людзі, што паказалі сябе патрыётамі, якія могуць утрымаць краіну, могуць яе далей удасканальваць», — заявіў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што новаму пакаленню, магчыма, і не варта захоўваць менавіта такую Беларусь, якая яна цяпер, бо краіна ўвесь час будзе ўдасканальвацца. «Але я вельмі спадзяюся, што гэта будуць акуратныя, разумныя людзі, якія, удасканальваючы, будуць ісці ад жыцця.... Калі не ведаеш, што рабіць (я часта пра гэта казаў у 1990-х — пачатку 2000-х), ідзі да людзей, яны табе падкажуць, яны скажуць», — параіў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах беларускага лідара, сёння пакаленне, якое стварала і будавала краіну, павінна зрабіць усё, каб маладое пакаленне, якое прыйдзе да ўлады, магло, нічога не ламаючы, не крадучы, не прысвойваючы, перадаць краіну новым пакаленням. І ў гэтым пытанні вялікая роля належыць Усебеларускаму народнаму сходу. «УНС — гэта сур'ёзны народны канстытуцыйны кантроль над усімі працэсамі ў краіне. І Прэзідэнту, які б там ні быў Прэзідэнт, давядзецца лічыцца з тымі рашэннямі, якія будуць вынесены на Усебеларускім народным сходзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, калектыўны розум 1200 чалавек не бывае памылковым, ён абярэ аптымальны варыянт нашага развіцця.

«УНС павінен акуратна знайсці сваё месца ў нашым грамадскім ладзе. Гэта мы з вамі павінны зрабіць. Таму будзем казаць пра гэта на чарговым Усебеларускім народным сходзе», — канстатаваў беларускі лідар. Ён папрасіў дасведчаных, вельмі дарослых людзей не адыходзіць ад гэтага працэсу. «Вы не сыходзьце. Мы сыдзем тады, калі моладзі перададзім у спадчыну тое, што мы з вамі пабудавалі», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## «ДАВАЙЦЕ ТРЫМАЦЦА. У ІМЯ ВЫРАТАВАННЯ НАШАЙ КРАІНЫ»

Асобную ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на неабходнасць выпрацаваць дзяржаўную ідэалогію. Гэта пытанне таксама будзе абмяркоўвацца на УНС. «Але я заўсёды казаў аб тым, што спяшацца тут нельга... Памылкі не павінна быць. Гэтая дзяржаўная ідэалогія павінна захапіць увесь народ. І там ужо не будзе эліты і сялян, рабочых — яна павінна захапіць увесь народ», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сёння актыўна выкарыстоўваецца паняцце «грамадзянская супольнасць». Але што разумець пад гэтым паняццем — пытанне адкрытае. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што раней паняцце «грамадзянская супольнасць» і ўсё, што яго напаўняе, было прымацавана да разумення гэтага паняцця Захадам. «І вы разумееце, каго яны мелі на ўвазе складовымі часткамі гэтай грамадзянскай супольнасці. У свой час я настойліва прапаноўваў нам вызначыцца. Грамадзянская супольнасць — нармальнае паняцце. Але галоўнае — што гэта такое. На дадзены момант мы вызначыліся. І далі магчымасць прадстаўнікам суб'ектаў грамадзянскай супольнасці быць актыўнымі будаўнікамі нашай дзяржавы і ўсяго грамадскага ўкладу нашай краіны», — сказаў Прэзідэнт. Асабліва актыўныя дэбаты па гэтаму пытанню ішлі пры распрацоўцы паправак у Канстытуцыю.

«Я ўсё больш думаю: гэта пытанне закрытае ці не? Думаю, што не. Яго закрываць не трэба. Магчыма, з'явяцца новыя суб'екты грамадзянскай супольнасці. Ну і потым, калі ісці ад жыцця — гэта наогул мой прынцып, — што нас падштурхоўвае сёння да таго, каб гэта пытанне закрыць? Таму давайце яго пакінем пакуль адкрытым. Прыйдзе час — мы канчаткова, калі ў гэтым будзе неабходнасць, вызначымся», — заявіў беларускі лідар.

Ён пагадзіўся з меркаваннем, што 2020 год з яго цяжкасцямі і выклікамі трэба было б прыдумаць, калі б усяго гэтага не адбылося. «Мы шмат чаго ўбачылі. Саміх сябе ў люстэрку ўбачылі... Але ці гатовыя мы да таго, каб сказаць, што ў нас ёсць ідэі для нашай ідэалогіі? Не ведаю. Перш за ўсё, вы мяне павінны ў гэтым пераканаць. Калі я буду перакананы, я гатовы пайсці наперадзе, арганізоўваць працэс», — сказаў Прэзідэнт. Ён прапанаваў працягваць работу над гэтым пытаннем. «Нам вельмі патрэбна дзяржаўная ідэалогія. Вельмі патрэбна. Давайце разам аб гэтым думаць», — сказаў ён. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, асновай гэтай ідэалогіі маглі б стаць нейкія біблейскія пастулаты і законы — хрысціянскія каштоўнасці, а таксама цяперашняя Канстытуцыя. «Яна ж плён усяго пражытага намі, — заўважыў ён. — Я не хачу сказаць, што ўсёй асновай. Стаўпом для нашай ідэалогіі — гэта дакладна. Будзем сустракацца, абмяркоўваць гэтыя праблемы. Асабліва што датычыцца будучыні нашай дзяржавы», — рэзюмаваў беларускі лідар.

Прэзідэнт запэўніў усіх, што ўладу растапыранымі пальцамі ніхто не трымае. Пры гэтым ён прывёў ЗША, якія пазіцыянуюць сябе як прыклад дэмакратыі. «Апошнія выбары паказалі, якая «дэмакратыя». Пісталет з-за пояса — і страляе, не гледзячы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Дзяўчыну, якая абараняла амерыканскія інтарэсы, расстралялі і ўсё (забойства 6 студзеня 2021 года ў Капітоліі былой амерыканскай ваеннаслужачай Эшлі Бэбіт). І нямала такіх. Дык гэта што мы бачылі ў прамым эфіры. Таму я наўпрост сказаў, каб заходнікі і іншыя разумелі, што ў Беларусі ёсць моцная ўлада. Мы часта пра гэта гаворым. Але растапыранымі пальцамі ніхто яе трымаць не будзе», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу на мінулыя выбары дэпутатаў і некаторыя прэтэнзіі з боку апанентаў. «А чаго вы хацелі? Вы ж нас навучылі. Вы ж нас увогуле падвялі да таго, што мы павінны жорстка дзейнічаць, выбудоўваючы вертыкаль улады і фарміруючы вакол яе моцных людзей. Што ж вы хацелі? Вы ж нам «дэмакратыю» падкінулі, а самі па гэтым шляху не пайшлі. Мы сёння ў гэтым ужо перакананыя», — заявіў Аляксандр Лукашэнка ў адрас апанентаў. Паводле яго слоў, у 2020 годзе беларусам дапамог Бог. «Калі б мы не выстаялі, тут была б вайна. Яны б сюды зацягнулі войскі НАТА. Уявіце рэакцыю Расіі — пад Смаленскам войскі НАТА. Гэта ж ядзерная вайна была б. Мы выстаялі. Бог дапамог», — сказаў ён. Па словах беларускага лідара, сёння сітуацыя яшчэ больш небяспечная. Тым, што мы яе не бачым. Напалову не бачым. «І я ў тым ліку, маючы больш аб'ём інфармацыі. Таму трэба акуратна. Ідзём па тонкім лёдзе. Лішні няправільны крок — правалімся. Нас ніхто не выратуе. А самі абараніцца і сябе выратаваць мы не зможам. Акулы вакол такія, што не паспеем азірнуцца — з'ядуць, — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. — Зайздроснікаў шмат. Таму час выбраў нас. Давайце трымацца. У імя выратавання нашай краіны. Яшчэ раз хачу сказаць: ад мяне вы не чакайце ні здрады, ні змены нейкага курса налева-направа. Разам з вамі вызначымся па ўсіх пытаннях. Я вам гэта абяцаю», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «ШЧЫРА ГАНАРУСЯ, ШТО Я — БЕЛАРУСКА»



Фота БелТА.

## БЕЛАРУСАК АДРОЗНІВАЕ БЯЗМЕРНАЯ ЛЮБОЎ ДА СВАЁЙ КРАІНЫ

Павіншавала пераможцаў, уручыўшы ўзнагароды ў намінацыі «Сэрца аддаю людзям», **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

— На мой погляд, ацэнка важная для кожнага. Чалавеку заўсёды трэба казаць добрыя словы, калі ён сапраўды гэтага варты. І такая добрая традыцыя, якая ёсць у нашай краіне, — ушанаванне жанчын года — працягваецца шмат гадоў. Мы заўсёды з вялікай радасцю збіраемся, каб сказаць словы ўдзячнасці жанчынам, якія ўносяць важкі ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай краіны, у выхаванне падрастаючага пакалення, якія маюць актыўную грамадзянскую пазіцыю, — адзначыла Наталля Качанава. — Жанчыны заўсёды падтрымліваюць ініцыятывы, накіраваныя на стварэнне і развіццё, далейшае ўдасканаленне любой галіны, якая ёсць у нашай краіне. Сёння тут сабраліся прадстаўніцы з усіх рэгіёнаў Беларусі, розных прафесій, розных сфер і розных узростаў. І калі мы ўсе збіраемся разам, гэта заўсёды цудоўна.

Наталля Качанава дадала, што актыў Беларускага саюза жанчын знаходзіцца пад вялікім уражаннем ад нядаўняй сустрэчы з кіраўніком дзяржавы.

— Прэзідэнт заўсёды падтрымлівае жаночыя ініцыятывы. Уласна кажучы, і гэта ініцыятыва — ушанаванне жанчыны года — была падтрымана Прэзідэнтам яшчэ ў далёкім 2007 годзе. Цяпер гэта ўжо добрая традыцыя ў нашай краіне. Таму мы з вялікай радасцю сустракаемся з жанчынамі, якія праявілі сябе. І такіх дастаткова шмат у нашай краіне. Але ўсё роўна найлепшыя павінны быць.

Журналісты папрасілі спікера Савета Рэспублікі вылучыць галоўныя якасці беларусак.

— Беларуская жанчына прыгожая, разумная, таленавітая — у гэтым няма ніякага сумнення, — адказала Наталля Качанава. — Але самае галоўнае, што адрознівае беларускіх жанчын, — бязмерная любоў да сваёй краіны, свайго народа, да той справы, якой яна займаецца, і незвычайнае пачуццё патрыятызму.

## УСІМ ЖАНЧЫНАМ ДЗЯКУЙ ЗА НЕАБЫЯКАВАСЦЬ І ЎКЛЮЧАНАСЦЬ У ЖЫЦЦЁ КРАІНЫ

Арганізатарам конкурсу «Жанчына года» выступае Беларускі саюз жанчын.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Працу любой жанчыны важна ацэньваць. Конкурс «Жанчына года» ў нас ужо праходзіць не першы дзясятак гадоў, і мне здаецца, гэта важна. Таму што жанчыны ўкладаюць шмат сіл душэўных і фізічных для таго, каб акрамя сваёй асноўнай працы ўключыцца яшчэ ў грамадскую дзейнасць. І гэта такая добрая нагода падвесці вынікі конкурсу і сказаць гэтым жанчынам дзякуй, — адзначыла **старшыня Беларускага саюза жанчын Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ.**

Яна падзялілася, што адбор пераможцаў конкурсу заўсёды вельмі сур'ёзны.

— Ведаю, што сёлета конкурс праходзіў актыўна, было вельмі шмат заявак. Яны прыходзілі ў нашы абласныя арганізацыі, у горад Мінск. Адбор быў вельмі сур'ёзны. Таму тут сёння, канешне, найлепшыя прадстаўніцы з усёй краіны. І я рада, што мы зможам сёння іх павітаць і ўшанаваць, — падкрэсліла старшыня БСЖ. — Абсалютна розныя намінацыі. «Не старэюць душой ветэраны» — гэта жанчыны-ветэраны, якія столькі зрабілі для краіны і працягваюць гэта рабіць. Вельмі важна іх адзначыць. «Матчына слава» — гэта шматдзетныя мамы, а таксама мамы, якія выхоўваюць прыёмных дзетак. «Паспяховы кіраўнік» — гэта жанчыны, якія сумяшчаюць работу на асноўным прадпрыемстве і актыўнае грамадскае жыццё. Сёння тут шмат дастойных, цудоўных жанчын. І ўсім я хачу сказаць вялікі дзякуй за работу, неабыякавасць, за ўключанасць у жыццё краіны.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член прэзідыума Беларускага саюза жанчын Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ** дадала, што жанчына павінна быць смелай, надзейнай, патрыятычнай і прыгожай, мудрай, каб яна ўмела захаваць пераемнасць пакаленняў.

— А гэта вельмі важная стратэгічная наша мэта, якая, дарэчы, зафіксавана ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. І наша жанчына такая і ёсць. І сёння самыя дастойныя і лепшыя ўшанаваны заслужанымі ўзнагародамі, — падзялілася дэпутат.

## ДУХОЎНЫ СКЛАДНІК ДАПАМОЖА ПЕРААДОЛЕЦЬ УСЕ КЛОПАТЫ

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** узнагародзіў пераможцаў у намінацыі «Актыўная грамадзянская пазіцыя»:

— На такім урачыстым мерапрыемстве асабліва прыемна і ганарова прысутнічаць, таму што ваша актыўная грамадзянская пазіцыя — дзейсная сіла, энергія, якая дазваляе нам быць упэўненымі ў тым, што мы пераадолеем любыя непрыемнасці, любыя падкопы і інтрыгі нашых ворагаў. Я ў гэтым упэўнены. І за гэта вам дзякую. Жанчына — гэта заўсёды мір, каханне, якасць, стварэнне, клопат. Вам за гэта ад мужчын падзяка. Дзякуй богу, што ў нас у краіне так, і дай бог, каб было так заўсёды.

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін** уручыў узнагароды і прыгожыя падарункі пераможцам у намінацыі «Духоўнасць і культура»:

— Прыемна падводзіць вынікі мінулага года і раздзяляць гэту радасць з вамі. І разам з тым менавіта ў такія хвіліны звяртаеш увагу, наколькі разнастайна і плённа працуюць нашы жанчыны ў розных кірунках. Пры гэтым задаешся пытаннем: дзе і як вы бераце сілы і магчымасці? Думаецца, што назва намінацыі «Духоўнасць і культура» дае адказ на гэта пытанне. Дух — гэта найбольшы складнік душы чалавека, які спалучае яго з Богам і ўзбагачае.



## ЗАЎЖДЫ ГАТОВА ПРЫЙСЦІ НА ДАПАМОГУ

Пераможца рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2023» у намінацыі «Не старэюць душой ветэраны» **салігарчанка Алена КОЗЫРАВА,** якая, дарэчы, першай у Беларусі стварыла музей маці, падзялілася сваімі эмоцыямі.

— Мая намінацыя — «Не старэюць душой ветэраны». Але мы, ветэраны, паверце, хочам свой вопыт, усё, што мы ведаем пра жаночы рух, перадаць моладзі. Таму што жанчына — гэта душа сусвету. Я стаяла каля вытокаў зараджэння жаночага руху, менавіта Беларускага саюза жанчын. Я сёння бачу цудоўных, выдатных жанчын, якія праявілі сябе як прафесіяналы, як жанчыны, якія гадуюць і выхоўваюць дзяцей, займаюць самую актыўную грамадзянскую пазіцыю, што, я ўпэўнена, спрыяе таму, каб наша цудоўная Беларусь развівалася і ішла ўпэўненымі тэмпамі ў будучыню, пакідаючы нашым дзецям, унукам, нашай моладзі цудоўную краіну.

Паводле яе слоў, цырымонія ўзнагароджання аб'яднала сапраўдных патрыётак сваёй краіны:

— Тут сабраліся жанчыны, якія па-сапраўднаму любяць сваю краіну, вялікую і малую радзіму, сваю сям'ю, любяць усё, што іх акружае, і, паверце, яны гатовы і далей рабіць усё, каб мы жылі ў мірнай, спакойнай суверэннай Беларусі. Я шчыра ганаруся, што я беларуска. Я ганаруся сваёй краінай. Я ганаруся Беларускім саюзам жанчын, з якім ужо крочу па зямлі больш за 30 гадоў.

Пераможца ў намінацыі «Актыўная грамадзянская пазіцыя», **намеснік начальніка Універсітэта грамадзянскай абароны па вучэбнай рабоце, палкоўнік унутранай службы Святлана МАРШЫНА** адзначыла, што беларускія жанчыны заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу:

— Я старшыня пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза жанчын МНС. Мая актыўная грамадзянская пазіцыя заключаецца ў тых добрых справах, якія мы робім для краіны, людзей вакол нас, для тых, каму патрэбна дапамога, своечасова падстаўленае плячо, абарона. Таму наша дзейнасць адзначана. У нас маладая арганізацыя. Саюз жанчын МНС быў створаны ў 2018 годзе, мы адзначалі летась пяцігоддзе. Але самыя, мусіць, яркія эмоцыі, уражанні — калі ты прыязджаеш да дзетак з асаблівасцямі. І тая цеплыня, якую яны табе аддаюць, — дарагога варта для ўсіх. «У нашай паўсядзённай дзейнасці, на жаль, мы не заўсёды заўважаем, што робім, і нам здаецца, што гэта паўсядзённая руцінная работа. А такія конкурсы — магчымасць прадэманстраваць, наколькі ты актыўны і наколькі нашы жанчыны добрыя, спагадлівыя. Гэты конкурс дазваляе нашым жанчынам раскрыцць сябе», — падкрэсліла пераможца.

**Доктар эканамічных навук, прафесар Ларыса ПАКУШ** адзначана ў намінацыі «Не старэюць душой ветэраны». Яна выкладае ў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі:

— Мой працоўны стаж — 51 год. А мой жыццёвы шлях складаецца з трох этапаў. Першы, класічны, — выкладчык. Потым партыйная работа восем гадоў, потым дзевяць гадоў паслом і зноў выкладчык. Я шмат дзе была і магу сказаць: дзякуючы Прэзідэнту такое ўважлівае стаўленне да жанчын.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ЗША пачалі падрыхтоўку вайскоўцаў да баявых дзеянняў у Арктыцы



Злучаныя Штаты Амерыкі пачалі падрыхтоўку вайскоўцаў да баявых дзеянняў у Арктыцы з мэтай абараніць сваё дамінаванне ў гэтым рэгіёне, што сведчыць аб росце занепакоенасці Вашынгтона дзеяннямі Расіі і Кітая, перадае партал Business Insider. Паводле даных выдання, у лютым на Алясцы прайшлі вучэнні з мэтай адаптаваць вайскоўцаў да экстрэмальных умоў Арктыкі. У іх прынялі ўдзел восем тысяч амерыканскіх вайскоўцаў з 11-й паветрана-дэсантнай дывізіі і вайскоўцы партнёраў ЗША. Салдаты, якія прынялі ўдзел у вучэннях, расказалі, што мерапрыемства такога ўзроўню ўваходзіць у лік найноўшых вайсковых вучэнняў. Як адзначыў Business Insider, ЗША ўступаюць у новую эпоху напружанай стратэгічнай канкурэнцыі ў Арктыцы, і чым больш сапернікаў актыўныя ў рэгіёне, тым большая верагоднасць канфлікту.

## Маск лічыць, што штучны інтэлект можа стаць разумнейшым за ўсё чалавецтва да 2029-га

Амерыканскі прадпрымальнік Ілан Маск лічыць, што штучны інтэлект (ШІ) ужо налета будзе разумнейшы за любога асобнага чалавека, а да 2029 года, магчыма, перасягне ўсіх людзей разам узятых. Пра гэта паведаміла ТАСС. Такім чынам Маск пракаментаваў пазіцыю амерыканскага футуролага Рэйманда Курцвейла, які лічыць, што ўзровень развіцця штучнага інтэлекту будзе супастаўны з інтэлектам любога чалавека да 2029-га. У канцы мінулага года Ілан Маск выказаў занепакоенасць хуткасцю развіцця тэхналогіі ШІ і назваў яе патэнцыяльнай пагрозай існаванню чалавецтва. Ён параўнаў штучны інтэлект з «двухбаковавострым мячом», які можна выкарыстоўваць як на карысць, так і на шкоду.

## Фермеры павесілі на вароты дома французскага сенатара мёртвых дзікоў

Французскія фермеры атакавалі рэзідэнцыю сенатара Франсуа Патрыята ў Крэансі (камуна ў Бургундыі) і падвесілі на яе варотах мёртвых дзікоў, паведаміла штодзённая французская газета Ouest-France. Аграрыі таксама раскідалі перад домам Патрыята гной і шкуры жывёл. Пратэстоўцы пакінулі графіці з надпісамі: «Не забывайце свае карані», «На гэты раз вы перадасце пасланне Макрону!». Фермеры абвінавачваюць сенатара ў падтрымцы сельгаспалітыкі прэзідэнта Францыі, супраць якой яны выступаюць. Сенатар асудзіў «жорсткае і бруднае прыніжэнне», якое адбылося каля яго дома. Ён падаў скаргу, праводзіцца расследаванне інцыдэнту. Як вядома, Франсуа Патрыят — колішні дзяржаўны сакратар і міністр сельскай гаспадаркі і рыбалоўства.

# НА ПАПЕРЫ І Ў «ДАПОЎНЕНАЙ РЭАЛЬНАСЦІ»

## Пабывалі на выстаўцы, прысвечанай Дню Канстытуцыі

**Ад Статута Вялікага Княства Літоўскага да апошняй рэдакцыі Асноўнага Закона Беларусі: з унікальнымі дакументамі і выданнямі з фондаў Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, а таксама іншых навуковых устаноў краіны можна азнаёміцца на выставе да 30-годдзя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і інстытута прэзідэнцтва. Экспазіцыю прадставілі ў Прэзідэнцкай бібліятэцы.**



Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Юлія СЯРМЯЖКА.

Задача выставы — паказаць гісторыю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, адзначыла **загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Прэзідэнцкай бібліятэкі Юлія СЯРМЯЖКА**. Увазе грамадскасці прапануюцца рарытэты не толькі з фондаў Прэзідэнцкай бібліятэкі, але і з Нацыянальнага архіва Беларусі і Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці. Напрыклад, унікальныя дакументы аб абмеркаванні Канстытуцыі і ўнясенні правак.

— Мы захоўваем нашу гістарычную памяць, і на выставе прадстаўлены ўсе дакументы, пачынаючы ад Дэкларацыі, якая змяніла Канстытуцыю 1978 года, да Канстытуцыі 1994 года, а таксама наступныя рэдакцыі са зменамі на падставе рэферэндумаў. Яшчэ тут прадстаўлены прыклады газетных артыкулаў аб тым, як ішло абмеркаванне. Унікальныя і выданні сучаснай Канстытуцыі: падарункавыя, кішэнныя, яны таксама маюць гістарычную каштоўнасць, — расказала Юлія Мікалаеўна.

У прыватнасці, ёсць на выставе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь шрыфтам Брайля (для сляпых і чытачоў са слабым зрокам). Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі выдаў Канстытуцыю Беларусі шрыфтам Брайля ў 2022 годзе. Выданне знаходзіцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

### ЦІ ДАСТУПНЫ АСНОЎНЫ ЗАКОН?

Законы сваёй краіны трэба ведаць. Ці даступная Канстытуцыя Беларусі для шырокага кола чытачоў?

— Напярэдадні Дня Канстытуцыі мы правялі даследаванне, каб даведацца, наколькі даступны наш Асноўны Закон, — расказала **намеснік дырэктара Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь па асноўнай дзейнасці Ала ПЕНДА**. — Быў праведзены маніторынг усіх кнігарняў не толькі Мінска, але і рэгіёнаў. Мы высветлілі, што выданні Канстытуцыі ў абавязковым парадку прысутнічаюць на ўсіх кнігарнях (ад 10 да 526 экзэмпляраў). Цэны вельмі дэмакратычныя. Самае даступнае выданне Канстытуцыі каштуе 1 рубель 32 капейкі (у мяккай вокладцы). Самае дарагое, якое было намі выяўлена, — падарункавае, з дзвюх кніг: Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь на беларускай і рускай мовах, аб'яднанае ўпакоўкай-карабам. Каштуе яно 36 рублёў 85 капеек: таксама дастаткова даступны кошт. Ёсць у продажы і выданне кішэннага фармату, якое было прадстаўлена на адзіным дні галасавання ў выглядзе падарунка для тых, хто, дасягнуўшы 18-гадовага ўзросту, упершыню прыняў удзел у выбарах. Такую ініцыятыву прапанавала Цэнтральная выбарчая камісія. Выданне, створанае сумесна з камандай Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, унікальнае і тым, што зроблена выключна з беларускіх матэрыялаў, пачынаючы ад паперы (Добрушская фабрыка) і заканчваючы вокладкай.



Таксама супрацоўнікі Прэзідэнцкай бібліятэкі правялі маніторынг віртуальнага гандлю: Канстытуцыя прысутнічае і ў асартыменце электронных магазінаў. Прапануюць усе віды дастаўкі, ад самавывазу да дастаўкі на дом, расказала Ала Пенда.

— А тыя, хто хоча скарыстацца сваім правам на бясплатны доступ да інфармацыі, прыходзяць у бібліятэкі, — працягнула Ала Аляксееўна. — Маніторынг паказаў, што ва ўсіх бібліятэках Беларусі Канстытуцыя ёсць у неабходнай колькасці, і нават калі ўсе выданні знаходзяцца на руках, прапануецца электронны варыянт, размешчаны на афіцыйным прававым партале і ў шматлікіх базах даных, якія прадстаўлены ў кожнай бібліятэцы. Калі чалавек прывык чытаць друкаванае выданне, ён можа выкарыстаць міжбібліятэчны абанемент. Друкаваны экзэмпляр будзе дастаўлены ў любую бібліятэку краіны, — падсумавала яна.

Намеснік дырэктара паведаміла, што Канстытуцыя — лідар па частаце чытацкіх запытаў і выдачы чытачам на рукі сярод прававой літаратуры. Хто ж чытае Канстытуцыю?

— У большасці гэта моладзь: студэнты, магістранты, аспіранты, слухачы розных ВНУ нашай краіны. Пішуць яны курсавую работу або дысертацыю, з'яўляюцца фізікамі ці лірыкамі, усё роўна звяртаюцца да Асноўнага Закона. Старэйшае пакаленне цікавяць каментарыі, дзе праз прававыя акты падрабязна распісаны ўсе дзеянні кожнага артыкула. Правёўшы даследаванне, мы зрабілі выснову, што Асноўны Закон Беларусі — Канстытуцыя — даступны абсалютна ўсім грамадзянам нашай краіны, — падвяла вынікі Ала Пенда.

### ПРА ШТО РАСКАЖА АЛЕСЯ

Штогод Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь выдаецца тыражамі ад 7 тысяч экземпляраў, паведамілі супрацоўнікі Прэзідэнцкай бібліятэкі. Але эпоха лічбавізацыі патрабуе і новых падыходаў да падачы прававой інфармацыі, у першую чаргу школьнікам і студэнтам. На маладую аўдыторыю (і не толькі) арыентаваны сумесны праект Прэзідэнцкай бібліятэкі з кампаніяй «Арфокс» — лічбавая Канстытуцыя. Праект пакуль далёкі ад поўнай рэалізацыі, але першыя вынікі ўжо ёсць. Ала Пенда перакананa, што ён стане прарывам у прававой асвеце. Пакуль на выстаўцы журналістам і наведвальнікам прапанавалі яго пілотную версію.

Ідэя праекта ў тым, каб прыцягнуць маладое пакаленне да ведання Асноўнага Закона краіны праз новыя тэхналогіі, расказалі **распрацоўшчыкі праекта Яўген ЦЫБУЛЁЎ** і **Сяргей МІНЕЦ**.

— Адна з такіх ідэй прыйшла да спецыялістаў Прэзідэнцкай бібліятэкі, і мы вырашылі зрабіць канцэпт віртуальнага кансультанта, які ў дапоўненай рэальнасці будзе расказваць аб законах нашай краіны, — сказаў Яўген Цыбулёў.

Віртуальнага кансультанта завуць Алеся. Яна здольная цытаваць артыкулы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

— У далейшым мы плануем выйсці на такі фармат, калі перад карыстальнікам у поўны рост з'яўляецца кансультант — дзяўчына Алеся (яе вы бачыце праз смартфон або віртуальныя акуляры), і карыстальнік можа спытаць у яе дакладную фармулёўку любога артыкула Канстытуцыі, а таксама даведацца пра свае правы — вучня, студэнта ці ў цэлым грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, — і яна адказа жа адпаведнымі цытатамі з Канстытуцыі. Праект знаходзіцца ў працэсе стварэння, над ім працуюць спецыялісты з Беларусі, — расказалі распрацоўшчыкі.




У Алесі блакітныя вочы і цёмныя валасы, яна апранута ў строгі шэры гарнітур. «Рада прадставіць вам унікальны праект, які зменіць наша ўяўленне аб прававых асновах нашага грамадства — праект лічбавай Канстытуцыі, — паведамляе яна. — Мы выкарыстоўваем перадавыя тэхналогіі дапоўненай рэальнасці, каб дапамагаць вам, дзе б вы ні знаходзіліся. Кожны з вас у любым пункце свету можа атрымаць кансультацыю па розных пытаннях, якія датычаць нашай Канстытуцыі. Гэта інавацыя ў галіне даступнасці прававых ведаў. Адна з ключавых асаблівасцяў нашага праекта — магчымасць задаць любое пытанне па Канстытуцыі і атрымаць вычарпальны адказ. Ваша права на разуменне і веданне сваіх правоў павінна быць забяспечана».




— Кансультант працуе без дадатку, — тлумачыць распрацоўшчык. — З дапамогай тэлефона скануем QR-код, і камера пераходзіць у рэжым дапоўненай рэальнасці.

«Пакуль пілотны праект рэалізуецца на сродкі кампаніі-распрацоўшчыка, — расказала Ала Пенда, — але мы спадзяемся, што яго атрымаецца рэалізаваць на дзяржаўным узроўні». Іншыя праекты кампаніі «Арфакс» накіраваны на захаванне гістарычнай памяці: на выстаўцы, прысвечанай юбілею Канстытуцыі, распрацоўшчыкі прадэманстравалі стэнды аб генацыдзе беларускага народа і 80-годдзі вызвалення Беларусі. З дапамогай смартфона і QR-кодаў стэнды «ажываюць» — і карыстальнік атрымлівае відэашэраг з лічбамі, дакументальнымі кадрамі і іншай інфармацыяй.

— Мы вядзём працу з рознымі арганізацыямі, яны будуць размяшчаць у сябе такія стэнды, — адзначыў Яўген Цыбулёў. — У свеце распрацоўваюцца дэвайсы дапоўненай рэальнасці, яны ўкараняюцца ў паўсядзённае жыццё, гэта найбліжэйшая будучыня. Пакуль мы — адны з першых у нашай краіне, хто паказвае, як гэта можна рэалізаваць у тых ці іншых сацыяльных праектах.

У прыватнасці, у планах кампаніі — распрацоўка QR-кодаў для вакзалаў і аэрапортаў, з дапамогай якіх праз дапоўненую рэальнасць госці краіны змогуць пазнаёміцца з сімваламі беларускай дзяржаўнасці (сцягам) і ўбачыць відэаролік аб прыродзе і грамадзянах Беларусі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# Як данесці мастацкае слова ў дзень заўтрашні?

## Аб чым гаварылі на сімпозіуме літаратараў «Пісьменнік і час»

**Традыцыйна напярэдадні Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу прайшоў сімпозіум «Пісьменнік і час». Удзельнікам была прапанавана для абмеркавання тэма «Партнёрства ў імя будучыні». На сустрэчы сваімі думкамі падзяліліся спікеры з Беларусі, Расіі, Ірана, Егіпта і іншых краін.**



Сярод тэм, якія абмяркоўваліся падчас сімпозіума, — актуальнасць кнігі ў сучасным жыцці, выклікі, што стаяць перад пісьменнікамі, місія, якую павінны выконваць літаратары, і пошук шляхоў у будучыню, дзе кніга павінна быць не менш, а яшчэ больш запатрабаванай, чым сёння.

**Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПЯРЦОЎ** параўнаў пісьменніцкі сімпозіум з мазгавым штурмам, які збірае вельмі эрудзіраваных людзей, з вялікім жыццёвым багажом, крэатыўным мысленнем, шырокімі сувязямі як у сваёй краіне, так і за мяжой. Іх лічаць лідарамі меркаванняў. Творчыя асобы здольныя ацаніць працэсы, якія адбываюцца, і разам выпрацаваць падыходы па вырашэнні пэўных праблем.




Калі раней важна было захаваць класічную літаратуру, якая перадае традыцыйныя каштоўнасці, знайсці падыходы, формы яе падачы, каб яе не выціснула лёгкая, забаўляльная камерцыйная літаратура, то сёння над пісьменнікамі навісае новая пагроза. Штучны інтэлект пачынае пісаць кнігі, якія нават цяжка адрозніць ад аўтарскіх. Прычым магчымасці тут каласальныя, машыне можна задаць любыя ўмовы: напрыклад, каб усе абзацы пачыналіся з аднолькавых літар, каб былі розныя кульмінацыі, канцоўкі. Штучны інтэлект можа нават пры напісанні такіх твораў прааналізаваць вялікі пласт інфармацыі, якая ёсць у вольным доступе. Пісьменнікам і нават пісьменніцкім групам (якія сёння працуюць над адным сюжэтам) не ўгнацца за развіццём сучасных тэхналогій. І менавіта гэтай праблеме ўдзялілі ўвагу многія з удзельнікаў форуму. Варта сказаць: многія з іх упэўнены, што ўсё ж машына не здольная замяніць сапраўднага творцу.

**Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ**, нягледзячы на тое, што падобныя пытанні толькі пачынаюць уздымацца ў беларускім і расійскім грамадствах, выказаў упэўненасць: штучны інтэлект ніколі не зможа перадаць усе эмоцыі, адчуванні, парывы сэрца. Толькі кніга яскравага, мудрага, моцнага чалавека, які ўзяў на сябе працу быць літаратарам, можа стаць той, якую будуць любіць тысячы людзей. Сёння вельмі важна супрацьстаяць тым скажоным каштоўнасцям і мадэлям, калі замест сямейнага ачага, мамы з татам з'яўляецца набор бацькоў пад лічбамі адзін і два, выступаць за духоўную традыцыю, культурную, славянскую, хрысціянскую.

Акрамя таго, штучны інтэлект не можа ўвабраць увесь той жыццёвы вопыт, які назапашаны многімі пакаленнямі, ва ўсялякім разе, для гэтага яму спатрэбілася б адсканаваць усе крыніцы, пачынаючы ад старажытных, да тых кніг, газет і часопісаў, што выдаваліся за апошнія сто гадоў. І хоць штучны інтэлект не страшны як набор электронных праграм, як заўважыў **рэктар Санкт-Пецярбургскага гуманітарнага ўніверсітэта прафсаюзаў, прафесар, акадэмік Аляксандр ЗАПЯСОЦКІ**, галоўная небяспека ў тым, што за ім стаяць людзі: без імён, якія ні перад кім не адказваюць за свае ўчынкі і выкарыстоўваюць сучасныя тэхналогіі, каб мільёнам навязваць погляды, мадэлі развіцця. Уласна, штучны інтэлект, на яго думку, адзін з небяспечных сімптомаў звонку, які звязаны са знікненнем інтэлектуалаў, філосафаў, мысліцеляў. Страчваючы іх, краіны пазбаўляюцца і лідарскіх пазіцый, і аўтарытэту ў сусветнай цывілізацыі. Напрыклад, у пачатку XX стагоддзя ў Еўропе былі такія пасіянарыі, краіны ўжо дасягнулі пэўнага дабрабыту, калі вялікая колькасць людзей атрымала доступ да медыцыны, адукацыі, культуры. Здавалася, што прыйшоў зручны час, каб будаваць свет з высокай культурай і духоўнымі каштоўнасцямі. Замест гэтага пачала насаджацца масавая культура, культ матэрыяльнага спажывання, калі нормай стала кожны сезон набываць новую вопратку, каб праз кароткі час яе выкінуць, і рабіць тэхніку, якую трэба абнаўляць кожны год. Гэта ў выніку вядзе да спусташэння рэсурсаў планеты і дэфармацыі духоўнага свету чалавека. Таму сёння і ўзрастае роля пісьменнікаў, якія павінны абараняць сапраўдныя культурныя каштоўнасці.

Як заўважыў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўны рэдактар — дырэктар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**, напэўна, самым важным ганарарам для пісьменніка будзе, калі ён пабачыць, як яго слова адгукнецца ў заўтрашнім дні, калі дзякуючы яму будуць захаваны мір, духоўнасць і мараль.

Сёння аўтары не адмаўляюцца ад таго, каб выразна, часам прамалінейна выказваць сваю ацэнку часу. Яшчэ гадоў 5-8 таму ўзнімаліся пытанні аб тым, што не хапала публіцыстыкі, а сёння на стэндах кніжнай выстаўкі прадстаўлены творы такіх аўтараў, многія з якіх з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гэта адказ на тое, што адбываецца ў грамадстве, не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Адна з прэмій Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва ўручана Уладзіміру Ліхадзедаву за гісторыка-асветніцкі праект «Бацькаўшчына», серыю аўтарскіх кніг-альбомаў, дзе з дапамогай візуалізацыі, старых паштовак аўтар выказаў сваю грамадзянскую пазіцыю. Высокая ўзнагарода сведчыць пра тое, што яго працы нададзена публіцыстычная і палітычная ацэнка...

**Публіцыст, пісьменнік, журналіст Андрэй БЫСТРЫЦКІ** падзяліўся сваімі поглядамі наконт выклікаў, якія час падкідвае пісьменнікам. Так, штучны інтэлект можа аказацца карысным дзякуючы таму, што пазбавіць людзей ад руціннай работы па кампіляцыі інфармацыі, але для пісьменніка гэта штуршок для выхаду на якасна новы ўзровень, калі патрабуецца большая канцэнтрацыя на творчасці. Яшчэ адна праблема звязана з сучаснымі тэхналогіямі. Яны паглыбілі нас у бясконцы свет пісьма. Ніколі раней так масава і так многа людзі не пісалі. Часам у сацыяльных сетках можна прачытаць гісторыі, напісаныя звычайнымі людзьмі, часта цудоўныя, з яскравым гумарам. У выніку размываюцца межы паміж пісьменнікамі, журналістамі і тымі, хто імі не з'яўляецца. А яшчэ мы сутыкнуліся з перавытворчасцю інфармацыі, што хутчэй раз'ядноўвае, а не наадварот. І тут пісьменнікам трэба задумацца, як можна трансфармаваць камунікацыю, аднавіць страчаную іерархію і спрыяць рэнесансу прафесійнай літаратуры.

Адна з тэм, якая была ўзнята падчас сімпозіуму, — захаванне гістарычнай праўды, — звязана з 80-годдзем вызвалення Беларусі. Сёння, калі інтэрнэт з'яўляецца адной з галоўных крыніц інфармацыі для маладога пакалення, вядзецца вялікае ўздзеянне на розум і душы, што можа прывесці да фарміравання скажонага ўяўлення пра Вялікую Айчынную вайну, пра Перамогу, і нават тыя злачынствы, што здзяйсняліся на акупаванай захопнікамі тэрыторыі. Сёння вядзецца новы пошук форм работы з хлопцамі і дзяўчатамі. У школьнікаў аказаліся запатрабаваныя добра ілюстраваныя брашуры. Але бадай адной з самых эфектыўных форм з'яўляюцца жывыя сустрэчы, як кажуць, твар у твар. Пісьменнікі ідуць у студэнцкія і вучнёўскія калектывы, распавядаюць чытачам не толькі пра свае творы, але і вядуць шчырыя размовы на розныя тэмы. Як заўважыў Алесь Карлюкевіч, у гэтай рабоце нараджаецца сіла, упэўненасць, што ёсць людзі, каму наша мастацкае слова спатрэбіцца і заўтра.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Кацярыны УРБАН.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродненская табачная фабрика «Неман»**

**Аукцион состоится 17.04.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- сигаретная машина MK9CM, заводской № 54867, 1984 год выпуска («Molins»/Англия/);<br>- сигаретно-упаковочная машина OS 4000, заводской № 06440, 1984 год выпуска («Sohmermund»/Германия/);<br>- марочный аппарат AMOC, заводской № 8, 2001 год выпуска;<br>- установка упаковывания изделий в пленку, заводской № 28, 2007 год выпуска (ООО «ТЕХПАК» /РФ/);<br>- сигаретная машина MK9CM, заводской № 54847, 1984 год выпуска («Molins»/Англия/);<br>- сигаретно-упаковочная машина OS 4000, заводской № 06418, 1984 год выпуска, («Schmermund»/Германия/);<br>- марочный аппарат AMOC, заводской № 5, 2001 год выпуска (ОАО «ГТФ «Неман»);<br>- установка упаковывания изделий в пленку 025.015, заводской № 34, 2007 год выпуска (ООО «ТЕХПАК»/РФ/);<br>- запасные части к сигаретной машине «MK9CM»;<br>- запасные части к упаковочной машине «OS4000/AMOC/ТЕХПАК»;<br>- запасные части к упаковочной линии «TU-SL/3-279.6000 Plus HP/CP1»;<br>- запасные части к сигаретной линии «SIGMA-8000/GAMMA/MFT8-SR»;<br>- упаковочная линия «TU-SL/3-279.6000 Plus HL/CP1», заводской № 202225/2286685/2141612, 2002 год выпуска («SASIB S.p.A»/Италия/);<br>- упаковочная машина «Модель SBM», заводской № Z2510950396, 2010 год выпуска («SASIB S.p.A»/ Италия/);<br>- пропилено-обертывающий автомат «Т-20» от линии для упаковки сигарет с фильтром, заводской № 9-01000167, 2002 год выпуска («SASIBS.p.A»/Италия/);<br>- пакетирующий автомат «3С.154» от линии для упаковки сигарет с фильтром, заводской № 2180510, 2002 год выпуска («SASIB S.p.A»/Италия/);<br>- пакетирующий автомат «3С.154» от линии для упаковки сигарет с фильтром, заводской № 2180511, 2002 года выпуска («SASIB S.p.A»/Италия/);<br>- пакетирующий автомат «3С.154» от линии для упаковки сигарет с фильтром, заводской № 2180512, 2002 года выпуска («SASIB S.p.A»/Италия/);<br>- пакетирующий автомат «3С.154» от линии для упаковки сигарет с фильтром, заводской № 2180513, 2002 года выпуска («SASIB S.p.A»/Италия/);<br>- пакетирующий автомат «3С.154» от линии для упаковки сигарет с фильтром, заводской № 2180514, 2002 года выпуска («SASIB S.p.A»/Италия/);<br>- пакетирующий автомат «3С.154» от линии для упаковки сигарет с фильтром, заводской № 2180515, 2002 года выпуска («SASIB S.p.A»/Италия/).<br>Условия проведения аукциона: победитель аукциона обязан оплатить имущество в форме 100 % предварительной оплаты в течение 15 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи; вывоз имущества со склада Доверителя (Продавца) осуществляется за счет покупателя, погрузка осуществляется силами Доверителя (Продавца); имущество поставляется без упаковки в частично разобранном виде; возможна оплата предмета аукциона в иностранной валюте по официальному курсу соответствующей валюты к белорусскому рублю, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день подписания протокола о результатах аукциона |
| **Начальная цена продажи** | 1 736 837,78 руб. (один миллион семьсот тридцать шесть тысяч восемьсот тридцать семь рублей семьдесят восемь копеек) |
| **Сумма задатка** | 173 683 руб. (сто семьдесят три тысячи шестьсот восемьдесят три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 15.04.2024 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

**Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»**
СООБЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ ТОРГОВ
в форме открытого аукциона по продаже недвижимого имущества ОАО «Витязь», назначенных на 08.04.2024 в 12.00, опубликованных в газете «Звязда» 06.03.2024, на сайте Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/ru/ 05.03.2024.
Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63. УНП 390477566

ОАО «Сантехэлектромонтаж» доводит до сведения акционеров общества, что 05.03.2024 г. годовым общим собранием акционеров по всем вопросам повестки дня решение принято. УНП 400052115

# НА ТОЙ БОК ПРАХАДНОЙ



### САКАВІК — МЕСЯЦ ПРАМЫСЛОВАГА ТУРЫЗМУ

Летась у краіне была зацверджана адзіная класіфікацыя відаў турызму, усяго іх 13, і сёлета кожны месяц прысвечаны пэўнаму віду. Сакавік у Беларусі аб'яўлены месяцам прамысловага турызму.

— У нас дзейнічае стратэгія развіцця турызму да 2035 года, дзе асобны значны кірунак звязаны з развіццём прамысловага турызму. Мы ганарымся, што наша краіна яшчэ з савецкіх часоў захавала вытворчы патэнцыял, усе вядучыя брэнды, вытворчасці, прадпрыемствы. Але свет не стаіць на месцы. І цяпер менавіта прамысловы турызм можа надаць дадатковы імпульс развіццю вытворчай базы нашай краіны, — адзначыў **намеснік міністра спорту і турызму Алег АНДРЭЙЧЫК**.



Адным з флагманаў не толькі прамысловасці, але і развіцця прамысловага турызму ён назваў ААТ «Мінскі трактарны завод». Летась прадпрыемства па выніках Нацыянальнага рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь» у намінацыі «Найлепшы аб'ект прамысловага турызму» стала пераможцам.

Усяго ж сёння ў краіне яго развіццём займаецца больш за 130 прадпрыемстваў і арганізацый, якія ўжо маюць свае напрацоўкі, базу і, самае галоўнае, жаданне прымаць гасцей. Летась іх наведалі звыш 200 тысяч турыстаў. Калі параўноўваць з 2022 годам, то колькасць тых, хто зацікавіўся вытворчасцю, вырасла на трэць.

— Мы бачым, што мяняецца сама структура прамысловага турызму. Калі раней ён насіў характар прафесійна арыентавальнага і прадпрыемствы наведвалі школьнікі, то цяпер гэта пазнавальны прамысловы турызм. Сёння амаль усе аб'екты даюць магчымасць паглядзець і паўдзельнічаць у вытворчасці, прапануюць майстар-класы, — адзначыў Алег Андрэйчык.

Ён падкрэсліў, што ў краіне развіццю гэтага віду турызму на дзяржаўным узроўні надаецца вялікае значэнне. Пры Савеце Міністраў дзейнічае створаная тры гады таму нацыянальная рабочая група па развіцці прамысловага турызму. Гэта дазваляе вырашаць пытанні на нацыянальным узроўні і здымаць многія бар'еры.

У прыватнасці, з 1 студзеня пачаў дзейнічаць новы Закон «Аб турызме», які дазваляе работнікам прамысловых прадпрыемстваў займацца экскурсійнай дзейнасцю без атэстацыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### КАНВЕЕР КРЭАТЫВУ

Як адзначыў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ**, той факт, што Беларусь захавала свой прамысловы сектар — ад сельскай гаспадаркі да машынабудавання і цяжкай прамысловасці, — стаў адкрыццём для многіх гасцей Мінска і Беларусі.

— Заўсёды вельмі станоўчыя водгукі ад наведвання дзейных беларускіх фабрык, якія вырабляюць тавары, што сталі сімваламі нашай краіны. Гэта і льняныя вырабы, і кандытарскія, і, вядома, нашы знакамітыя трактары. Яны сапраўды разам з зубром і буслом адзін з найбольш пазнавальных брэндаў краіны. Яшчэ адна пазнавальная беларуская машына за межамі Беларусі — БелАЗ, — распавёў Дзмітрый Марозаў.

Трэба адзначыць, што і МТЗ, і БелАЗ, і іншыя заводы не адразу адчынілі свае дзверы. Былі апасенні і наконт прамысловага шпіянажу, і наконт парушэння тэхналагічнага працэсу, але паступова іх замяніла разуменне, што прамысловы турызм — адзін з галоўных інструментаў маркетынгу.

— Група турыстаў заўсёды падзеліцца ў сацсетках сваімі фотаздымкамі — пазітыўнымі, зараджанымі яркімі эмоцыямі, і тыя з'яўляюцца сур'ёзнай падмогай для маркетолагаў. Гэты вопыт сталі паступова пераймаць розныя прадпрыемствы ў краіне, і цяпер дзясяткі маршрутаў уключаюць у сябе наведванне вытворчасцяў. Імі цікавяцца турыстычныя фірмы, групы, індывідуальныя турысты. На многіх прадпрыемствах ствараюцца турыстычныя аддзелы, працуюць музеі, якія з'яўляюцца адпраўным пунктам экскурсіі па прадпрыемстве, — расказвае кіраўнік Нацыянальнага агенцтва па турызме.

Пры гэтым беларускі вопыт цікавы і каштоўны і для прадпрыемстваў у Расіі. У прыватнасці, такіх вытворцаў, як Мінскі трактарны завод, кандытарская фабрыка «Камунарка», піўзавод «Аліварыя», гадзіннікавы завод «Луч».

Імкнуцца не адставаць ад сталіцы і рэгіёны. Прымаюць турыстаў, напрыклад, ільнозаводы ў розных рэгіёнах, і найбуйнейшы з іх — у Оршы.

— Ліда — адносна невялікі горад, але мае цэлы кластар яркіх прадпрыемстваў харчовай прамысловасці, у прыватнасці, гэта завод харчовых канцэнтратаў, які вырабляе кукурузныя палачкі, «Лідская мука» і лідскі піўзавод, які выпускае не толькі піва, але і квас, і ярка іх прэзентуе. Непадалёку Бярозаўка — горад зусім невялікі, але з яркай цікавай вытворчасцю (ААТ Шклозавод «Нёман». — **«Зв.»**), які карыстаецца папулярнасцю ў турыстаў. Незвычайны брэсцкі кластар — фабрыка «Палессе», якая выпрабляе дзіцячыя цацкі, Брэсцкі смеццеперапрацоўчы завод — цікавая экалагічная тэма. Не менш захапляльны незвычайны маршрут і аб'екты для паказу распрацаваны ў Рэчыцы (нафтаздабываючая вытворчасць. — **Рэд.**), — расказаў Дзмітрый Марозаў.

Каб уключыць у турыстычныя маршруты новыя прадпрыемствы, Нацыянальнае агенцтва па турызме збіраецца правесці маркетынгавае даследаванне, якое выявіць, што цікава было б паглядзець наведвальнікам. Так што турыстычныя маршруты, а іх, дарэчы, у краіне распрацавана каля 140, будуць уключаць усё новыя вытворчасці.

Акрамя таго, прамысловы турызм — выдатны інструмент для прафесійнай арыентацыі школьнікаў, каб у гульнявой, забаўляльнай форме паказаць тую ці іншую вытворчасць. Самі прадпрыемствы арыентуюцца на гэту групу наведвальнікаў як магчымую будучую працоўную змену. У тым ліку Мінскі трактарны завод.

### ПАЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ЗБОРЦЫ ТРАКТАРА

Прамысловы турызм пачаўся тут у 2017 годзе: 16 студзеня адбылася першая экскурсія па прадпрыемстве. Ёй папярэднічала паўгадавая падрыхтоўчая работа.

— Нам прыходзілася «вынаходзіць новае кола» для завода, бо прадпрыемства прамысловае, выпускае тэхніку, дэталі, а турызм — нехарактэрная сфера дзейнасці, — узгадвае **вядучы спецыяліст па турызме ААТ «Мінскі трактарны завод» Сяргей СІДАРОВІЧ**.



Усё пачыналася з адной экскурсіі ў дзень, якую праводзілі работнікі. Цяпер на Мінскім трактарным заводзе функцыянуе асобны музейна-прамысловы цэнтр, дзе працуюць пяць спецыялістаў і экскурсіі праводзяцца з панядзелка да суботы чатыры разы на дзень.

— Для нашых турыстаў мы прапануем такія паслугі, як экскурсія, зборка трактара на галоўным канвееры і катанне на трактары. Таксама яны наведваюць пяты механічны цэх, дзе вырабляюцца дэталі для будучай тэхнікі, і выставу гатовай прадукцыі, — расказвае Сяргей Сідаровіч.

З кожным годам колькасць турыстаў на прадпрыемстве расце, у тым ліку расіян (за 2023 год іх колькасць вырасла на 199 %). Летась трактарны завод наведала больш за 15 800 чалавек, асноўнай часткай былі дзеці ў рамках прафарыентацыі.

— Для нас прамысловы турызм — гэта найперш імідж, прафарыентацыя школьнікаў. Многія дзеці сёння мараць стаць блогерамі, айцішнікамі, мадэлямі. Аднак важна пазнаёміць школьнікаў з іншымі прафесіямі, паказаць, што ёсць сучасныя вытворчасці. Многія ўяўляюць старое, бруднае прадпрыемства, цяпер гэта не так. Завод укладвае сродкі як у аднаўленне парку станкоў, так і ў аднаўленне экалагічнага кірунку, — дзяліцца Сяргей Сідаровіч.

Што ж больш за ўсё цікавіць школьнікаў (а іх прымаюць на экскурсію з дзевяці гадоў)? Вядома, пратэсціраваць моц самой тэхнікі.

— У нас пры ўваходзе дзейнічае выстаўка гатовай прадукцыі, там дзецям даецца магчымасць палазіць, сфатаграфавацца з нашымі трактарамі. Некаторыя да гэтага часу паспяваюць стаміцца, бо экскурсія паўтарагадзінная. Аднак калі падыходзяць да тэхнікі і чуюць, што можна палазіць, стомленасць прападае і іх не выцягнуць адтуль, — расказвае прадстаўнік трактарнага завода.

Запісацца на экскурсію на флагман беларускай вытворчасці можна па мабільным тэлефоне, у сацсетках і месенджарах — «Вайберы», «Ватсапе», «Тэлеграме» — і па электроннай пошце. Для школьнікаў яна каштуе 10 рублёў, для дарослых — 20 рублёў. Кожны наведвальнік атрымлівае падарунак з промапрадукцыяй завода.

### ПРАЙСЦІ ПАСВЯЧЭННЕ Ў НАФТАВІКІ

Што паглядзець у рэгіёнах больш падрабязна на прыкладзе Гомельскай вобласці, расказаў **загадчык сектара турызму ўпраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама Ігар НАЗАРЧУК**:

— У нашым рэгіёне прамысловы турызм прадстаўляе каля 20 прадпрыемстваў. У пачатку сакавіка мы правялі рэкламна-інфармацыйны тур для турыстычных агенцтваў і аператараў, падчас якога наведалі кандытарскую фабрыку «Спартак», аб'яднанае акцыянернае таварыства «Гомсельмаш», вытворчае аб'яднанне «Крышталь», дзе вырабляюць ювелірныя вырабы, і зусім маладое прадпрыемства — фабрыку мастацкіх вырабаў «Любна». Цікавыя экскурсіі, якія вельмі спадабаліся. «Фішка» Гомельскай вобласці — шакалад, у гэтым сэнсе мы маленькая Швейцарыя. Гэта наш брэнд, і, наведаўшы фабрыку, можна пабачыць, як вырабляецца наша прадукцыя. Дарэчы, экскурсіі тут распісаны на два месяцы наперад. На Гомсельмашы можна паглядзець, як паводзяць сябе нашы камбайны на абкатцы, як нараджаецца гэта машына. На «Крышталі» патрымаць у руках брыльянт ці злітак золата, які важыць 4,5 кг.

У рэгіёнах можна паглядзець, як вырабляюцца палескія сыры на Тураўскім малочным камбінаце, на прадпрыемстве «Мазырпіва» — пасмакаваць збіцень і медавуху, на «Мазырсолі» — пабачыць, як робіцца соль. «Беларуснафта» ў Рэчыцкім раёне прапануе паназіраць, як здабываецца нафта, і прайсці пасвячэнне ў нафтавікі з адпаведным абрадам «памазання». А ў кавярні прадпрыемства вам прапануюць адпаведныя стравы, напрыклад «Чорнае золата», чорную макарону і іншае.

### РАЗАМ З СУСЕДЗЯМІ

У беларускім вопыце развіцця прамысловага турызму зацікаўлены і расійскі бок, дзе індустрыяльны турызм развіваюць у 71 з 89 рэгіёнаў. Гэта пацвердзіў міжнародны семінар «Прамысловы турызм як брэнд і стратэгія», які прайшоў у беларускай сталіцы 12 сакавіка.

— Літаральна год таму ў нас пачалося ўзаемадзеянне з Беларуссю ў дадзенай галіне. Гэта быў першы Міжнародны форум прамысловага турызму, які праходзіў у Кемераўскай вобласці, на Кузбасе. Калегі з Беларусі прадставілі свае практыкі развіцця прамысловага турызму. Мы былі проста захоплены тым сістэмным падыходам, які ёсць у такіх прадпрыемстваў, як БелАЗ, Мінскі трактарны завод. У іх маецца распрацаваныя метадалагічныя матэрыялы, створаны турыстычны прадукт. У Расіі сёння ў развіццё прамысловага турызму ўцягнуты тысячы прадпрыемстваў і прыйшоў час пашырацца і абменьвацца вопытам, — расказала **Вольга ШАНДУРЭНКА, дырэктар праекта дывізіёна «Гарадская эканоміка» Агенцтва стратэгічных ініцыятыў па прасоўванні новых праектаў (Расія)**.

Мяркуецца, што вынікам работы расійскай дэлегацыі ў Беларусі стане стварэнне як агульнай метадалагічнай пляцоўкі, на якой спецыялісты змогуць дзяліцца найлепшымі практыкамі развіцця прамысловага турызму, кантактаваць, так і агульнага інфармацыйнага поля, якое стане асновай для арганізацыі індустрыяльных маршрутаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

На ўласныя вочы

# БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК І ПРОПІСІ ІЕРОГЛІФАЎ

## Шукаем цікавыя кнігі на Міжнароднай кніжнай выставе

**Штогадовая Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш сёлета ўжо 31-я, па-ранейшаму — падзея, якая выклікае цікавасць. Беларуская класіка на стэндах выставы прадстаўлена дастаткова шырока.**

— Вырашыла набыць зборнік Коласа на будучыню, бо ўсё роўна гэта школьная праграма, праз пару гадоў дочкі будуць вывучаць, — кажа наведвальніца выставы. — Сёння многія называюць папяровыя кнігі «пылазборнікамі», прыносяць іх у бібліятэкі або здаюць у макулатуру. А я лічу, што калі добра падабраць хатнюю бібліятэку, кнігі становяцца крыніцай радасці і антыстрэсам. Мне падабаецца перачытваць любімыя творы ў папяровым варыянце. Вядома, можна чытаць і электронныя кнігі, але мне з экрана знаёмы тэкст падаецца «чужым». Дэтэктыў яшчэ можна так пачытаць, а вось «Новая зямля» (я люблю гэты твор) у электронным фармаце чытаецца не так, як у папяровым, — асабіста мне не хапае шолаху старонак.



У гэтым годзе цэнтральным экспанентам выставы стала Ісламская Рэспубліка Іран.



Выстава знаёміць з навінкамі кнігавыдавецтва 20 краін свету

### ЭЛЕКТРОННАЯ VS ПАПЯРОВАЯ

Шмат хто скажа, што ў нашы дні папяровая кніга прайграе электроннай ці аўдыякнізе. І ўсё ж у папяровай па-ранейшаму ёсць прыхільнікі. Здаецца, і насіць яе з сабой цяжка, і спампаваць сёння можна практычна любую кніжную навінку, не ўстаючы з канапы (прычым танней, чым купляць яе ў класічным, папяровым, фармаце), а ўсё ж і ў сучасным свеце нямала тых, хто па-ранейшаму аддае перавагу менавіта такому фармату.

— 25 рублёў за кнігу — шмат? Але людзі па 40 рублёў аддаюць за кілаграм каўбасы. А кніга — гэта сур'ёзная праца. Ні ў адной краіне свету добрая кніга ў нашы дні не каштуе танна, — кажа **Наталля РАЖКО, вядучы спецыяліст аддзела рэалізацыі выдавецтва «Мастацкая літаратура»**. — Вядома, сёння любую кнігу можна спампаваць у інтэрнэце, прачытаць у электронным фармаце. Але я, напрыклад, ведаю шматлікіх прыхільнікаў папяровай кнігі, бо гэта мастацтва, і яно ніколі не знікне, што б ні казала моладзь. У нейкі момант нават і яна прыходзіць да таго, што бярэ ў рукі папяровую кнігу. Таму што тая дае тактыльнасць, асаблівае ўспрыманне тэксту, магчымасць падыхаць непаўторным кніжным водарам. Праз гэта кніжныя фанаты не знікнуць ніколі. Сёння, вядома, не трэба ўсе кнігі купляць у папяровым варыянце. Але ёсць такія кнігі, якія варта мець дома менавіта ў класічным, папяровым, фармаце, бо гартаць іх проста прыемна і радасна.

Студэнтка-другакурсніца Марына належыць якраз да аматараў папяровай кнігі:



У XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выставе прымаюць удзел выдавецтвы з Расіі, Кітая, Бразіліі, Турцыі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Туркменістана, Кубы, Венесуэлы, Індыі, Сірыі, Егіпта, іншых краін.

кажа, прыйшла на выставу, каб знайсці «што-небудзь пачытаць».

— За дзень стамляешся ад экранаў: тэлефона, ноўтбука, камп'ютара, а папяровая кніга дае вачам адпачыць, — кажа яна. — І яшчэ папяровая кніга для мяне — гэта асаблівая атмасфера з дзяцінства. Рытуал. Заварыць гарбату, захутацца ў коўдру і перад сном пашамацець старонкамі даўно любімай ці новай, захапляльнай кнігі...

### ПА-РАНЕЙШАМУ НАЙЛЕПШЫ ПАДАРУНАК

Прадстаўнікі розных выдавецтваў, якія працуюць на стэндах выставы, у большасці сваёй далёкія ад лірыкі, але з Марынай згодныя. Маўляў, філасофстваваць тут няма чаго: на пытанне, ці вымірае «папера», адказваюць лічбы. Спажывецкі попыт у кнігарнях па-ранейшаму высокі, а значыць папяровыя кнігі і ў лічбавую эпоху адчуваюць сябе ўпэўнена.

Памятаеце савецкі слоган «Кніга — найлепшы падарунак»? Дык вось: так і ў нашы дні, сцвярджаюць выдаўцы. Асабліва ўлічваючы цэны на папяровыя выданні. А яны дастаткова высокія. І калі дзіцячыя кнігі стартуюць ад пяці рублёў, то ў дарослым сегменце за мяккую вокладку вы выкладзеце не менш за 15 рублёў, а выданне ў цвёрдай вокладцы абыдзецца рублёў у 25–30 і вышэй. Ды і дзіцячая літаратура ў большасці сваёй не таннейшая. Кошт на айчынную класіку (на добрай паперы, у цвёрдай вокладцы) таксама пачынаецца ад 20–25 рублёў. Зрэшты, як гавораць наведвальнікі, цэны на выставе ўсё ж ніжэйшыя, чым у кнігарнях.

Прадстаўніца «Мастацкай літаратуры» расказвае, што сярод пакупнікоў папяровых кніг — людзі вельмі розныя.

— Ёсць пастаянныя пакупнікі, якія прыходзяць на выставу штогод і купляюць усе навінкі, якія намецілі сабе за год: на гэтым кірмашы кнігі заўсёды таннейшыя. У нас ёсць цэлы стол, дзе кошт зніжаны на 50 %.

Гаворачы аб «кніжных» падарунках, нельга не згадаць фотаальбомы, якіх на выставе сёлета вельмі шмат, прычым як у айчынных, так і ў замежных выдаўцоў. Цэны менавіта на гэтую катэгорыю кніжнай прадукцыі могуць быць дастаткова дэмакратычнымі. Напрыклад, маляўнічы альбом, прысвечаны роду Радзівілаў, выдадзены ў трох частках музеем-запаведнікам «Нясвіж», каштуе да 30 рублёў (кожны том). А фотаальбом пра беларускую прыроду (у розных варыянтах) можна знайсці за 11—19 рублёў. Падарункавы асобнік з ілюстрацыямі «Дзікага палявання караля Стаха» — па выглядзе сапраўдны старадаўні фаліянт — абыдзецца ў 25 рублёў.



Кніга з экспазіцыі ўнікальных выданняў з фондаў Пасольства Ірана.



Серыя «Традыцыйны светалад беларусаў» створана Інстытутам філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук.

Сучасны свет, вядома, патрабуе новых падыходаў і ад выдаўцоў.

— Напрыклад, з навінак для дзяцей у нас — серыя «Пачытайчык»: можна, чытаючы кнігу, спампаваць дадатак на тэлефон і пагуляць, — кажа Наталля Ражко. — Папулярнасцю карыстаецца дзіцячая серыя «100 пытанняў пра Беларусь», таксама з QR-кодамі: дапоўненая рэальнасць ілюструе тэкст.

Ну а самая складаная катэгорыя сучасных чытачоў для любога аўтара і выдаўца — падлеткі, адзначае яна. У гэтай чытацкай катэгорыі бяспройгрышны варыянт (разлічаны, праўда, у першую чаргу на бацькоў: кожнаму ж хочацца, каб спадчыннік рос разумным і адукаваным) — рознага роду адукацыйная літаратура. З таго, што запомнілася, — серыя «Традыцыйны светалад беларусаў», створаная Інстытутам філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук. Пакуль што выйшлі два тамы — «Касмалогія» і «Народная тэалогія», добра ілюстраваныя альбомы, дзе тэкст дублюецца на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай. «Гэта свайго роду «папулярная этнаграфія» — спрадвечная філасофія беларускага народа, выкладзеная проста і даступна для дзяцей і падлеткаў», — тлумачыць **прадстаўнік выдавецтва «Беларуская навука» Кацярына ЦГОЕВА.** Сёлета выйдуць у свет яшчэ два тамы. Каштуюць альбомы 16 рублёў 80 капеек.

І, дарэчы, яшчэ пра сучасныя рэаліі: Інстытут мовазнаўства НАН прадставіў наведвальнікам 31-й выставы-кірмашу самы новы «Слоўнік беларускай мовы».

— Выданне змяшчае 150 тысяч слоў, і гэта самы поўны слоўнік нашай мовы з усіх, якія існуюць, — кажа Кацярына. — У апошнія гады ў паўсядзённы ўжытак прыходзіць шмат новых слоў, напрыклад звязаных з камп'ютарнай сферай, эканомікай, палітыкай, і ўсе яны апісаны ў новым выданні слоўніка.

### МІЖНАРОДНЫ КВАРТАЛ

Сёлета цэнтральным экспанентам выстаўкі стала Ісламская Рэспубліка Іран.

А ўвогуле ў XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выставе прымаюць удзел два дзясяткі дзяржаў. Сярод іх — выдаўцы з Расіі, Кітая, Бразіліі, Турцыі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Туркменістана, Кубы, Венесуэлы, Індыі, Сірыі, Егіпта. У складзе дэлегацыі Егіпта, дарэчы, вядомая пісьменніца і публіцыст Доха Мустафа Асі, якая ўпершыню прымае ўдзел у Мінскім кніжным форуме.

Ну а самая вялікая экспазіцыя гасцей з далёкага замежжа, як ужо гаварылася, у Ірана.

— Мы прадстаўляем і дзіцячую літаратуру, і філасофскую, і рэлігійную, і мастацкую, — расказвае Ірына, якая працуе на іранскім стэндзе. — Увазе наведвальнікаў прапануем таксама выставу ўнікальных высокамастацкіх выданняў з фондаў пасольства: яны не прадаюцца, але ўбачыць іх варта, таму што кожнае з іх — твор мастацтва. А пачаць знаёмства з іранскай літаратурай беларускаму чытачу я раіла б са зборнікаў Амара Хаяма. Напрыклад, вось гэты невялікі каштуе ўсяго пяць рублёў, ён у перакладзе на беларускую Рыгора Барадуліна і Віктара Шніпа.

Кідаецца ў вочы вялікая колькасць моўных дапаможнікаў, прадстаўленых сёлета на выставе, — яны ёсць практычна на кожным замежным стэндзе. Напрыклад, прапануецца самастойна засвоіць асновы арабскай або кітайскай мовы. Пропісі іерогліфаў для школьнікаў — 12 рублёў, дарослыя пропісі і дапаможнікі па каліграфіі даражэйшыя, кошт залежыць ад паперы і фармату выдання.

Традыцыйна шырока прадстаўлены на Мінскай кніжнай выставе расійскія выдаўцы, у прыватнасці дзіцячая літаратура. Менавіта па кнігі для дзяцей вельмі часта прыходзяць людзі на гэтае мерапрыемства. Сярод навінак выдавецтва «Піцер», напрыклад, «Дзіўная генетыка» для маленькага чытача каштуе 14 рублёў.

Выстава-кірмаш закрыецца вечарам у нядзелю. Яе сямейнае наведванне — нядрэнны варыянт сумеснага адпачынку на бліжэйшыя выхадныя.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.**

**Многія жыхары Гаіці баяцца выходзіць з дамоў з-за бандыцкіх груповак, якія лютуюць у краіне, піша The New York Times. Па словах месцічаў, па вуліцах ходзяць і маленькія дзеці з аўтаматамі. Яны страляюць у людзей, а пасля спальваюць іх целы. «Я не ведаю, як гэта кваліфікаваць. Яны ўвогуле людзі?» — з жахам распавяла NYT мясцовая радыёвядучая Бландын Таніс. Большасць жыхароў выходзяць на вуліцы толькі для таго, каб набыць ваду і прадукты. Эксперты адзначаюць, што запасы харчавання на Гаіці імкліва скарачаюцца, паколькі аўтамабільныя перавозкі цяпер небяспечныя, а парты знаходзяцца пад кантролем банд. У некаторых раёнах краіны ўжо некалькі месяцаў няма электрычнасці. На запраўках больш няма бензіну, і людзі набываюць паліва вёдрамі на чорным рынку. Урач сталічнай бальніцы Гаіці Жан-Марк Біке заўважыў, што пры адсутнасці чыстай пітной вады ўзрастае рызыка захворвання на халеру. Ён таксама падкрэсліў, што запасы крыві і кіслароду абмежаваныя. Што ж адбываецца на «райскім востраве»?**



# Крывавае пекла на «райскім востраве»

## Што адбываецца на Гаіці?



### ЦУНАМІ ГВАЛТУ

Сітуацыя ў сферы бяспекі і гуманітарная абстаноўка на Гаіці дэградуюць пасля забойства ў 2021 годзе прэзідэнта Жавенеля Маіза — з таго часу Арыэль Анры фактычна ўзначальвае краіну. Цяпер, паводле звестак СМІ, банды кантралююць больш за 80 працэнтаў тэрыторыі сталіцы і кансалідуюцца ў іншых рэгіёнах дзяржавы. Як адзначае CNN са спасылкай на даныя ААН, у краіне злачынныя групоўкі абыходзяцца з людзьмі як з таварам. Толькі за мінулы год у мэтах гандлю на вуліцах былі выкрадзены як мінімум 2490 чалавек. Калі іх сем'і не здольныя заплаціць за іх вызваленне, іх часта забіваюць.

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, тел./факс 80162918159. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** 100 % оплата в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 11 апреля 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 10 апреля 2024 г. до 17.00**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «ПМК-188» Воложинский район (222357, Минская обл., г. Воложин, ул. Пушкина, 24) проводит открытый аукцион по продаже следующего имущества:

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **первые торги** | | | |
| 1 | **Погрузчик универсальный «Амкодор 332С-01»,** 2008 г. в., рег. знак ОВ-5 2752, № Y3A332C4107080512, инв. № по бух. учету 116735. **Ковш 332С.51.000-01 для погрузчика «Амкодор 332С»,** инв. № по бух. учету 116736 | **20 244,00** | **2 024,00** |
| **Повторные торги, стоимость лота снижена на 30 %** (предыдущие извещения о продаже лота № 1 опубликованы в газете «Звязда» от 29.11.2023, 11.01.2024) | | | |

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. <u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %)</u> (покупатель) <u>**возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Шаг аукциона: 5 %.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Аукцион состоится **27.03.2024 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.03.2024** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.**

УНП 600019633

Нараджэнне традыцыі

# МУЗЫКА НА КОНЧЫКАХ ПАЛЬЦАЎ

## Чым запомніцца II Форум дырыжораў, які прайшоў у Магілёве

**Два дні музыкі, рэпетыцый, майстар-класаў праляцелі як адно імгненне. Аркестры народных інструментаў перажылі сапраўднае вясновае ўзрушэнне. У Магілёў прыехалі вядомыя дырыжоры Беларусі і Расіі. Юныя аркестранты пазашкольных, сярэдніх і сярэдніх спецыяльных устаноў мастацтваў, а таксама іх педагогі атрымалі неацэнныя веды і самі паказалі, на што здольныя. У анлайн-конкурсе, арганізаваным у рамках Форуму, узялі ўдзел каля 60 калектываў з розных абласцей Беларусі і Расіі. Форум дырыжораў выклікаў вялікі ажыятаж у культурным асяроддзі і даказаў, што вельмі патрэбны для развіцця музыкі.**

### Народны здабытак

Форум дырыжораў у Магілёве з'явіўся невыпадкова. Тут закладзены добрыя аркестравыя традыцыі і існуе адзіны ў краіне заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь аркестр народных інструментаў імя Л. Іванова. Леанід Іваноў, які стварыў гэты калектыў і адразу ж даў яму высокі старт, — чалавек-легенда ў музычным свеце. Яго выхаванцы сёння з'яўляюцца прафесарамі прэстыжных расійскіх ВНУ мастацтваў і вельмі падтрымліваюць гэты Форум, у тым ліку і сваёй прысутнасцю на ім.

**Кандыдат педагагічных навук, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, прафесар Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага інстытута культуры і Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М. А. Рымскага-Корсакава Віктар АКУЛОВІЧ** — адзін з вучняў Леаніда Іванова.

Маэстра ўспамінаў, наколькі неверагодна харызматычным быў яго педагог.

— Культуру рухаюць 5-7 працэнтаў тых людзей, якія працуюць у гэтым жанры, — разважае Віктар Акуловіч. — У іх ёсць ідэі, энергетыка, вакол іх аб'ядноўваюцца іншыя. У Японіі ёсць званне «Нацыянальны здабытак». Яно прысуджаецца тым, хто працуе з народным мастацтвам. Я двойчы быў са сваім калектывам у Японіі і добра ведаю, як там падтрымліваюць нацыянальную культуру. Дзяржава лічыць, што гэта менавіта тая культура, якая павінна ўзрасціць нацыю. У Леаніда Іванова былі ўсе складальнікі: адданасць нацыянальнай музыцы, талент, абаянне. Я помню і тую жалезную дысцыпліну, якая існавала на яго рэпетыцыях. Патрабавальнасць, арганізаванасць, якія былі пры Леанідзе Іванове, прыносілі вынік. Тыя флюіды, якія я і мае калегі атрымалі ў Магілёўскім музычным вучылішчы і канкрэтна ад Леаніда Іванова, суправаджаюць нас усё жыццё. Побач са мной у Санкт-Пецярбургу працуе прафесар Аляксандр Абакшонак — чалавек, які таксама закончыў Магілёўскае музычнае вучылішча. Нашы найлепшыя часы жыцця звязаны з аркестрам Леаніда Іванова. Мая жонка — дамрыстка — таксама вучылася ў Іванова. І што мяне асабліва парадавала ў гэты мой прыезд — тая энергетыка, якая існавала пры маэстра, дагэтуль працуе. Анлайн-конкурс, які таксама быў прысвечаны Леаніду Іванову, паказаў высокі ўзровень майстэрства сярод паслядоўнікаў вялікага майстра.

### Людзі, якія рухаюць музыку

Віктар Акуловіч, Уладзімір Шкуроўскі, Міхаіл Тоцкі, Яўген Алешнікаў, Дзмітрый Базанаў, Віктар Валатковіч — гэта імёны з сусветным гучаннем. Для кожнага музыканта вельмі ганарова пабываць на іх майстар-класах, канцэртах.

— Да нас прыехалі ганаровыя госці, прафесара з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Белгарада, Петразаводска — вакол іх мы ўсе і аб'ядналіся, — адзначыў **мастацкі кіраўнік міжнароднага культурна-адукацыйнага Форуму дырыжораў, мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь аркестра народных інструментаў імя народнага артыста Беларусі Л. Іванова Дзяніс ЧАРТА.** — Людзі прыехалі да нас не проста падырыжыраваць аркестрам, мы разам праводзім яшчэ і шмат адукацыйных мерапрыемстваў. Што датычыцца анлайн-конкурсу, то гэта вельмі добры стымулюючы момант. Удзельнікі рыхтуюць праграму, імкнуцца паказаць свае найлепшыя знаходкі. Гэта вялікі рост у адукацыйным плане. Сёлета падключылі да анлайн-конкурсу аркестры дзіцячых школ мастацтваў, дзіцячыя і педагагічныя калектывы. Дзякуючы Форуму развіваем і ўзмацняем нашу сферу. Ацэньваюцца праграма, узровень выканання, эмацыянальнае разуменне твора. Кожны дырыжор прадстаўляе свой калектыў, аркестр, рэгіён, а гэта новыя погляд, вопыт, школа.

Яркай падзеяй Форуму стаў Гранд-канцэрт, падчас якога аркестр народных інструментаў імя Л. Іванова выступаў пад кіраўніцтвам больш як 20 дырыжораў. Яму папярэднічала адкрытая рэпетыцыя, дзе можна было ўбачыць, як, вобразна кажучы, на кончыках пальцаў ствараецца ўнікальны музычны вобраз. У кожнага дырыжора свая энергетыка, свае думкі ў музыцы, свае эмоцыі і ўспрыманне. Для гледача гэта было вельмі незвычайнае відовішча.

### Высокія старты

Форум праводзіўся ў Магілёве другі раз, і колькасць яго ўдзельнікаў, прыхільнікаў, гледачоў істотна павялічылася. І, як выказваліся паважаныя госці, ёсць усе прыкметы таго, што фестываль выйдзе на дзяржаўны ўзровень. Пакуль ён праводзіцца па ініцыятыве Магілёўскай філармоніі і Палаца культуры вобласці, пры падтрымцы ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама і Магілёўскага каледжа мастацтваў.

— Я быў сведкам зараджэння ідэі і ўдзельнікам першага Форуму, — кажа Віктар Акуловіч. — Мы шмат гэтую тэму абмяркоўвалі з мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам аркестра Дзянісам Чартой. Гэта ён загарэўся ідэяй стварыць Форум пасля таго, як пабываў на парадзе дырыжораў аркестраў народных інструментаў у Белгарадзе. Калі мы размаўлялі пра магілёўскі фармат нашых сустрэч, ужо тады гучала думка, што адной з асаблівасцяў мерапрыемства павінен стаць адукацыйны складальнік.



Дзяніс ЧАРТА і заслужаны артыст Расіі Міхаіл ТОЦКІ на Гранд-канцэрце.

Сёлета Гран-пры ў анлайн-конкурсе сярод дзіцячых аркестравых калектываў узяў аркестр Бабруйскай дзіцячай школы мастацтваў імя У. Алоўнікава. Яшчэ 25 калектываў адзначаны дыпломамі I—III ступеняў. Сярод педагагічных аркестравых калектываў 13 лаўрэатаў I—II ступеняў. У катэгорыі аркестравых калектываў сярэдняй спецыяльнай адукацыі дыпломамі I—III ступеняў узнагароджаны 10 аркестраў рускіх народных інструментаў Беларусі і Расіі. І пяць дыпломаў I—III ступеняў былі ўручаны аркестрам беларускіх інструментаў. Гран-пры ў гэтай намінацыі атрымаў Віцебскі дзяржаўны музычны каледж пад кіраўніцтвам Сяргея Цімашэнкі. Адразу два дыпломы заваяваў Магілёўскі каледж мастацтваў, дзе праходзілі майстар-класы і іншыя мерапрыемствы Форуму. Дыпломам I ступені адзначаны народны аркестр народных рускіх інструментаў пад кіраўніцтвам Алены Цыганок і дыпломам II ступені — народны аркестр народных беларускіх інструментаў пад кіраўніцтвам Аляксандра Гаваркова.

— Усе ўдзельнікі сталі лаўрэатамі конкурсу, і гэта вельмі высокая адзнака, — лічыць **кіраўнік народнага аркестра народных рускіх інструментаў Магілёўскага каледжа мастацтваў Алена ЦЫГАНОК.** — Калі на I Форуме былі яшчэ і дыпламанты, то цяпер высокі ўзровень прадэманстравалі ўсе. Гэта прагрэс. Аркестры прадстаўлялі музычныя каледжы з розных абласцей і Мінска. Былі дырыжоры з Магілёва, Мінска, Гродна, Віцебска, Наваполацка, Мазыра, Ліды, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Петразаводска, Белгарада, Стаўрапаля. З боку калег назіраўся вялікі інтарэс, патрэба ў зносінах. У нас на Магілёўшчыне вельмі высокія аркестравыя традыцыі. Мы глядзелі розныя дырыжорскія школы, абменьваліся рэпертуарам, нешта цікавае бралі на заметку. Народу было шмат. Форум вельмі цёпла ўспрымаўся публікай.

### Аркестрам патрэбна навізна

**Галоўны дырыжор Белгарадскага акадэмічнага рускага аркестра, прафесар кафедры музычна-інструментальнага выканальніцтва Белгарадскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў і культуры, прэзідэнт Асацыяцыі дырыжораў прафесійных аркестраў народных інструментаў, заслужаны работнік культуры Расіі Яўген АЛЕШНІКАЎ** мае каласальны вопыт у рабоце з рознымі аркестрамі. Гэта па яго ініцыятыве ў Белгарадзе праводзіцца Усерасійскі парад дырыжораў аркестраў народных інструментаў, на які з'язджаюцца прафесіяналы з усіх куточкаў Расіі. І ён верыць, што ў магілёўскага Форуму дырыжораў вялікае будучае.

— Я ўпершыню на гэтым Форуме, але ў Магілёў прыязджаў гадоў 12 таму са сваім Белгарадскім акадэмічным рускім аркестрам на фестываль «Магілёўская вясна», — падзяліўся ён з карэспандэнтам «Звязды». — Калі Дзяніс Чарта быў у нас на парадзе дырыжораў, ён запрасіў мяне на Форум, і я з задавальненнем прыехаў. Вельмі добрая арганізацыя. Конкурс, які адбыўся паміж аркестрамі каледжаў, прадэманстраваў вельмі высокі ўзровень выканальніцтва і падрыхтоўкі. Цудоўныя калектывы. І тое, што тут праводзяцца майстар-класы мэтраў нашай дырыжорскай справы, вельмі важна. Форум не замыкаецца толькі на канцэртнай дзейнасці, хоць галоўным арганізатарам з'яўляецца філармонія. Каштоўна, што яна ўзаемадзейнічае з музычным каледжам, што сюды прыехалі дырыжоры вучэбных калектываў з усёй Беларусі.

Яшчэ адна перавага Форуму, пра якую казалі яго спікеры, — магчымасць абнавіць рэпертуар.

— На жаль, у нас у Расіі, напэўна, як і ў Беларусі, вельмі мала выдаецца партытур для аркестраў народных інструментаў, — адзначае Яўген Алешнікаў. — Гэта выдавецкая дзейнасць пасля развалу Савецкага Саюза практычна перарвалася. Гэтыя абавязкі на сябе ўзялі некаторыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. У прыватнасці, Віктар Акуловіч выдае музыку Андрэя Пятрова, Яўгена Славінскага, Валерыя Гаўрыліна, іншых выдатных кампазітараў. Але гэта ўсё ж такі не ўсерасійская дзейнасць. Тыраж вельмі абмежаваны, такія партытуры не заўсёды трапляюць у крамы і разыходзяцца ў асноўным у Санкт-Пецярбургу і Маскве. Прычым нават там іх бывае цяжка набыць. Таму мы і цэнім такія сустрэчы, дзе ёсць магчымасць абмяняцца рэпертуарам.

Дарэчы, Форум дырыжораў папулярызуе таленавітых беларускіх аўтараў. На іх творы ў Расіі вялікі попыт.

— Знаходжуся на майстар-класе, а студэнтка прысылае эсэмэску з просьбай, каб я прывёз ёй творы беларускага кампазітара Генадзя Ермачэнкава, — заўважае Віктар Акуловіч. — Яна цымбалістка, вучыцца ў Санкт-Пецярбургскім інстытуце культуры, выказала жаданне ўзяць творы гэтага аўтара ў свой рэпертуар.

### Дырыжоры просяць увагі

Мэта Форуму — папулярызацыя і развіццё аркестравага выканальніцтва ў Беларусі, узбагачэння нацыянальнай школы дырыжорскага майстэрства перадавым міжнародным досведам.

— Дырыжорскае мастацтва сёння наогул мае патрэбу ў вялікай увазе, — кажа **дырэктар заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь аркестра народных інструментаў імя Л. Іванова Магілёўскай філармоніі Алёна ФЯДЗЬКОВА.** — Хацелася б, каб аркестравае выканальніцтва развівалася. У нас мала прафесійных аркестравых калектываў. Таму спрабуем падтрымліваць сярэднія вучэбныя ўстановы, згуртаваць паміж сабой дырыжораў, каб была суполка, абмен вопытам.

Чаго не хапае, каб Магілёў стаў сталіцай аркестравага мастацтва?

— Недахоп праекта толькі ў тым, што мы не можам сабраць аркестры, якія павінны тут выступіць, не можам запрасіць дырыжораў са сваімі аркестрамі, — тлумачыць Віктар Акуловіч. — Але гэта ўжо пытанне дзяржаўнае. Для праекта робіца ўсё, каб ён выйшаў на дзяржаўны ўзровень. І тут паўстае пытанне фінансавання. Філармонія пашырыць рамкі не можа. Праект класны! Расіянам гэта цікава.

**Прафесар кафедры аркестравага дырыжыравання Расійскай Акадэміі музыкі імя Гнесіных, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор рускага народнага аркестра** гэтай **ВНУ «Душа Расіі» Уладзімір ШКУРОЎСКІ** падтрымлівае калегу.

— Форум вельмі цікавы і патрэбны, — кажа ён. — Яго адназначна трэба пашыраць. У нас ёсць фестываль «Музыка Расіі», які сёлета будзе праводзіцца ўжо ў 21 раз. Да нас прыязджаюць аркестры з еўрапейскай часці Расіі, а летась падключыўся Барнаул. Удзельнікі прывозяць акадэмічную музыку сучасных кампазітараў, напісаных для рускага народнага аркестра. Гэта вельмі цікавы кірунак. Сучасная музыка і сучасныя кампазітары даюць новы штуршок гэтаму жанру. Той жа Аляксей Рыбнікаў пісаў, дарэчы, і для народных інструментаў. Ёсць музыка, якую ён напісаў у канцы 60-х, але яе не ігралі. Мы ўзялі яе ў свой рэпертуар і шчаслівыя: яна цудоўная. У мяне на магілёўскім Форуме дырыжораў адбыўся семінар, на які прыйшлі кіраўнікі аркестраў, дырыжоры, зацікаўленыя людзі. Іх цікавіла, якая ёсць новая музыка, якія імёны, што ўжо зроблена і што толькі будзе. І нам не хапіла часу, каб усё абмеркаваць. У Форуму вялікі патэнцыял.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Кінакрокі

# Усё наперадзе

## З чым айчынны кінематограф падыходзіць да 100-гадовага юбілею

**Сёлета айчынны кінематограф адзначае прыгожую дату — 100 гадоў свайго існавання. За гэты час у гісторыю «Беларусьфільма» ўпісана шмат імён таленавітых творцаў, якія стварылі любімыя многімі фільмы, заявілі пра наша кіно ўсяму свету. А вось пра тое, як на працягу года будуць святкаваць юбілей, якіх прэм'ер дачакаецца глядач у бліжэйшыя месяцы і наколькі запатрабаваная беларуская кінапрадукцыя ў краіне і за яе межамі, расказалі прадстаўнікі Міністэрства культуры і нацыянальнай кінастудыі на нядаўняй сустрэчы з журналістамі.**

— Бягучы год для беларускага кіно знакавы, бо яно адзначае 100-гадовы юбілей. Але невыпадкова эмблемай стагоддзя беларускага кіно выбраны знак «Беларускаму кіно — сто гадоў. Усё наперадзе» і сімвал Бурацiна. Гэта бесклапотны чалавек, які заўсёды верыў у найлепшае, імкнуўся да поспеху і дабіваўся яго. Думаю, такі ж лёс і настрой і ў нашых сучасных кінематаграфістаў. Юбілейны год будзе сапраўды асаблівым годам, ён не звядзецца толькі да аднаго мерапрыемства 17 снежня 2024 года, — адзначыла **начальнік аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына ДРЫГА.** — Святочныя мерапрыемствы ў нас пройдуць на працягу года. Уключылася ў падрыхтоўку і правядзенне святочных, асветніцкіх, культурных мерапрыемстваў уся наша культурная грамадскасць. Гэта не толькі Міністэрства культуры, кінастудыя і кінапракатныя арганізацыі, але і нашы ўстановы вышэйшай адукацыі: Акадэмія мастацтваў, Універсітэт культуры і мастацтваў, факультэт журналістыкі БДУ, а таксама Нацыянальная акадэмія навук, архіў кінафотафонадакументаў і нашы абласныя ўпраўленні культуры, рэдакцыя часопіса «На экранах». Усе запрапанавалі свае мерапрыемствы для таго, каб год сапраўды прайшоў пад знакам кіно. Таксама ў рамках юбілейнага года запланаваны і разнастайныя выстаўкі. Акрамя часовых праектаў, варта чакаць адкрыццё новай экспазіцыі Музея гісторыі беларускага кіно.

— Наш музей актыўна рыхтуецца да 100-годдзя беларускага кіно. Найперш мы сканцэнтраваны на стварэнні новай пастаяннай інтэрактыўнай экспазіцыі. Інтэрактыўная яна таму, што мы хочам прыцягнуць увагу да яе розных катэгорый наведвальнікаў: і дзяцей, і студэнтаў, і дарослых людзей. Яны і так да нас прыходзяць, але настаў момант, калі патрэбна экспазіцыю абнавіць, і юбілей беларускага кіно — выдатная нагода зрабіць гэта, адлюстраваўшы комплексна насычаную гісторыю нашага кіно, — зазначыла **загадчык Музея гісторыі беларускага кіно філіяла Нацыянальнага гістарычнага музея Вераніка СЕБРУКОВІЧ.** — На сёння ў нас сфарміравана рабочая група па стварэнні новай пастаяннай экспазіцыі. Ёсць праект навуковай канцэпцыі. І ўжо пэўныя намёткі мы маем па візуальным рашэнні, як будзем прадстаўляць свае ідэі. Вядома, у першую чаргу там будуць музейныя прадметы, бо яны аснова для музейнай экспазіцыі. Але будзем выкарыстоўваць і інфармацыйныя тэхналогіі. Напрыклад, мультымедыйныя экраны, што дазволіць больш глыбока пазнаёміцца з тэмай гісторыі беларускага кіно, з яго стваральнікамі і прадстаўнікамі.

Не абыдуць увагай таксама і тэму 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З гэтай нагоды вытворчыя і кінапракатныя арганізацыі краіны рыхтуюць свае кінаакцыі, каб як мага болей людзей самых розных узростаў змаглі прычыніцца да найлепшага беларускага кіно, у якім адлюстраваны падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Таксама Міністэрства культуры Беларусі атрымала прапанову ад расійскіх калег уключыцца ў гэтую акцыю яшчэ і савецкія кінастужкі, таму калі кінапракатчыкі прапрацуюць усе пытанні ў прававым полі, то лінейка фільмаў значна пашырыцца...

— Я хацеў бы засяродзіць увагу на тым, што зараз наша кінастудыя, акрамя ўсяго іншага, вельмі сур'ёзную ўвагу аддае выпуску кіначасопісаў. Гэты вопыт аднавіў наш міністр культуры пасля наведвання кінастудыі «Лендок». І цяпер мы робім кароткаметражныя фільмы, якія будуць папулярызаваць нашу краіну. Гэта расповед пра медыцынскіх работнікаў, пра нашы культурныя ўстановы, пра нашу прамысловасць і прадпрыемствы. Будзем паказваць найлепшае кіно нашай краіны ўсяму свету, — дадаў **генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый АЛЯКСЕЙ.** — Яшчэ я хацеў бы сказаць, што, безумоўна, у нас шмат знакавых фільмаў. Але і сучасныя кінаработы таксама паказваюць, якія прапановы мае «Беларусьфільм» для сучаснага гледача. Зусім нядаўна мы прапанавалі кінаработу нашага маладога рэжысёра Кірыла Халецкага. І ён далей працягвае працаваць над вытворчасцю фільмаў. З чаканых прэм'ер тая ж кінастужка «Час вярнуцца» — вельмі важная для краіны, іншая кінапрадукцыя. Мне хочацца яшчэ нагадаць і пра работу над фільмам беларуска-кітайскай вытворчасці. Зараз у Міністэрстве замежных спраў знаходзіцца сінопсіс на ўзгадненні. Таму мы не спыняемся ў працы, працэс рухаецца.

У сваю чаргу, **начальнік аддзела маркетынгу кінастудыі «Беларусьфільм» Ігар КУЗНЯЦОЎ** расказаў пра тое, ці дае прыбытак кінавытворчасць і што сёння робіцца для прасоўвання беларускага кіно як у краіне, так і за яе межамі: «Калі назваць некалькі лічбаў па выніках мінулага года, то 65 % са 100 — гэта менавіта прыбытак па знешнеэканамічных дагаворах. Гэта сведчыць, што і нашы новыя фільмы, і наша кінабібліятэка карыстаюцца вялікім попытам, да іх ёсць інтарэс. І купляюць не толькі кінастужкі, а нават асобныя кадры. Пры падтрымцы нашага Міністэрства культуры, кіраўніцтва кінастудыі мы выйшлі на 51 рэгіён Расійскай Федэрацыі. Працуем там з кінапракатнымі дзяржаўнымі і прыватнымі арганізацыямі. Напрыклад, запрапанавалі ім ігравыя фільмы 2023 года — «Кіношнікі», «На другім беразе», «Ліст чакання», аднак у іх выклікаюць інтарэс і нашы фільмы савецкага перыяду, кіно перыяду нашай незалежнай Беларусі. Таму дзесьці разлічваем, што і партнёры нам дапамогуць, каб і расійскі глядач убачыў нашы фільмы ў сваіх кінатэатрах».

**Алена ДРАПКО.**

Глядзіце, хто прыйшоў

# Любіць эксперыменты і чорны колер

## Яўген Карняг стаў галоўным рэжысёрам Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек

**З пачатку бягучага сезона гэтая пасада заставалася вольнай. Пры гэтым тэатр планаваў і рыхтаваў прэм'еры, рэжысёрам якіх выступаў менавіта Яўген Карняг, які афіцыйна працуе тут, можа, і не так доўга, але яго сувязь з Беларускім дзяржаўным тэатрам лялек доўгая і трывалая.**



Адвучыўшыся ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, у 2005 годзе як акцёр тэатра лялек Карняг зведаў яго знутры, калі прыйшоў працаваць у калектыў, якім кіраваў яго настаўнік Аляксей Ляляўскі. А пасля пайшоў у вольнае плаванне як рэжысёр (айчынныя тэатралы могуць памятаць яго ўласны праект пад назвай KorniagTHEATRE), аднак некаторыя ідэі рэалізоўваў менавіта ў тэатры лялек. Прынамсі, у афішы цяпер значацца спектаклі Яўгена Карняга для дарослых: «Інтэрв'ю з вядзьмаркамі», «Запіскі юнага ўрача», які ў 2023 годзе быў высока адзначаны Нацыянальнай тэатральнай прэміяй як найлепшы ў намінацыі тэатраў лялек. Публіка ацаніла гэтую пастаноўку раней, як і іншыя работы рэжысёра, які мае сваё бачанне і адчуванне тэатра, у тым ліку таго, што ў народзе ўсё яшчэ называюць «лялечным»; і ўжо зразумела: не ўсё так адназначна (ну, паглядзіце нават спектаклі Карняга... хоць і яго папярэднікі таксама прыклалі намаганні для таго, каб развянчаць пэўныя стэрэатыпы, якія існавалі ў дачыненні да гэтага мастацтва). Увесь папярэдні шлях Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, які шмат у чым ішоў у авангардзе тэатральнага працэсу ў Беларусі, паказаў: у гэтай справе патрэбныя асобы, якія ўмеюць працаваць не толькі ў традыцыйным тэатры, але гатовыя здзяйсняць небанальнасцю і пошукам новых форм на высокім творчым узроўні. Так было, але чаго чакаць ад новага творчага кіраўніка?

**Нацыянальнай тэатральнай прэміяй неаднойчы адзначалі работы Карняга**, яго адметнае бачанне і почырк. У 2018 годзе найлепшым спектаклем у намінацыі тэатра лялек стала пастаноўка «Сёстры Грай» Мінскага абласнога тэатра лялек «Батлейка» з Маладзечна. А найлепшым эксперыментальным спектаклем прызналі яшчэ адну яго пастаноўку — «Бетон» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Насамрэч рэжысёр не абмяжоўваўся супрацоўніцтвам з адным калектывам, актыўна ставіў спектаклі ў іншых тэатрах як у Беларусі, так і за яе межамі.

**Філасофскі погляд на жыццё і свет** шмат у чым абумовіў такую запатрабаванасць. Прынамсі, тым, хто хоча зразумець, у чым асаблівы Яўген Карняг як рэжысёр, варта наведаць яго спектаклі, што ідуць у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі (акрамя вышэйзгаданага «Бетона», ён там паставіў раней «Шлюб з ветрам» і «Пачупкі»). Ужо ў гэтым сезоне адбылася прэм'ера спектакля «Забалоцце», які стаў завяршэннем своеасаблівай трылогіі. Усе яе пастаноўкі аб'ядналі фальклорнай асновай, спевамі, агульнай стылістыкай і, што самае галоўнае, аўтарскай ідэяй пра шлях чалавека на зямлі: вось ён нараджаецца, вось падыходзіць да стварэння сям'і і завяршае сваё жыццё.

**Увесь папярэдні шлях Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, які шмат у чым ішоў у авангардзе тэатральнага працэсу ў Беларусі, паказаў: у гэтай справе патрэбны асобы, якія ўмеюць працаваць не толькі ў традыцыйным тэатры, але гатовыя здзяйсняць небанальнасцю і пошукам новых форм на высокім творчым узроўні.**

**Усе спектаклі Карняга аўтарскія** — прыдумана ім самім. Нават калі ёсць літаратурная глеба, то інсцэніроўкі рэжысёр стварае сам, маючы на ўвазе пэўны вобраз спектакля. Ён бярэ тэму, якая хвалюе яго і, хутчэй за ўсё, іншых, і канцэптуальна прыдумвае спектакль. Рэалізаваць яго дапамагаюць артысты, якім цікавы розны тэатр, і мастакі-пастаноўшчыкі (найбольш яскравыя ідэі рэалізаваны ў супрацоўніцтве з Таццянай Нерсісян, якая з'яўляецца галоўным мастаком Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек).

**Яго часта называюць эксперыментатарам** — паводле таго, што пастаноўкі ў розны час ствараліся не толькі як драматычныя ці выключна лялечныя, а таксама як пластычныя, калі думкі выказваюцца праз рухі і цела выканаўцаў. Але насамрэч гэта аўтарскі тэатр, які можа быць розным, у залежнасці ад задач, якія патрэбна рэалізаваць.

**Імкненне ствараць яскравыя спектаклі для дзяцей** — яшчэ адна рыса, што нядаўна адкрылася прыхільнікам рэжысёра Яўгена Карняга. Бо да нядаўняга часу яго тэатральныя работы былі ў асноўным для дарослых і ў своеасаблівай стылістыцы, дзе зусім не віталася стракатасць. У гэтым сэнсе абсалютна іншымі падаюцца дзіцячыя спектаклі Карняга, якія з'явіліся ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек пасля ўладкавання рэжысёра ў трупу ў 2022 годзе. «Прадзедзены смех», «Разумны сабачка Соня» вельмі яскравыя ў адрозненне ад спектакляў для дарослых, якія паставіў рэжысёр. Яны маюць пэўную долю інтэрактыву і створаны з павагай як да малых, так і да іх бацькоў, якія не павінны сумаваць у тэатры, калі прыводзяць сюды дзяцей. Нават калі гаворка пра пастаноўкі для самых маленькіх, напрыклад пра прыгожую гісторыю пад назвай «Матылькі», пастаўленую на нядаўна адкрытай малой сцэне тэатра, — гэта таксама сведчыць пра жаданне працаваць на развіццё. Але трэба быць гатовым і да ўлюбёнага чорнага: прэм'ера гэтага сакавіка для дарослых паводле казак Андэрсена мае назву «На чорнай-чорнай вуліцы». Пашчасціць тым, хто загадзя паклапоціўся пра квіткі. Між іншым, гэта не дзіва для спектакляў Яўгена Карняга і Беларукага дзяржаўнага тэатра лялек, які шмат дзесяцігоддзяў працуе з рознымі аўдыторыямі, даючы прыклад мастацтва — як праз нацыянальныя традыцыі, так і праз сучасныя пошукі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Галоўны рэжысёр Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Яўген КАРНЯГ** запэўнівае чытачоў «Звязды»:

— Што датычыцца тэатра наогул і беларускага тэатра лялек, то я лічу, што ён мае велізарны патэнцыял. Таму што тэатр лялек — гэта не толькі забава для дзяцей, але і сапраўднае мастацтва, здольнае крануць сэрцы дарослых... Авангардны падыход беларускага тэатра лялек — гэта яго моц. Ён можа натхняць, правакаваць думкі і выклікаць эмоцыі.

***— Пасада галоўнага рэжысёра шмат у чым абавязвае, што можа адбіцца і на выбары вамі тэм, і на падыходзе да іх рэалізацыі...***

— Галоўнае — захаваць свабоду ў творчасці, нягледзячы на абавязкі галоўнага рэжысёра. Выбар тэм і іх рэалізацыя — гэта ключавыя моманты. Я ўпэўнены, што Беларускі дзяржаўны тэатр лялек працягне радаваць гледачоў сваім унікальным мастацтвам.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| № лота | Описание | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание – цех по производству блоков инв. № 640/С-15078. Назначение – 2 25 05 – здание специализированное для производства строительных материалов. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б/1. Общ. пл. 1727,9 кв. м. Год постройки – 1991. Составные части: 1. Здание склада; 2. Здание туалета; 3. Здание УДИМ; 4. Забор ж/б – 157,4 м. п; 5. Навес | **787 968,00** | **39 398,40** | **39 398,40** |
| | Здание – АБК с мастерской, инв. № 640/С-27985. Назначение – здание специализированное иного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б. Общ. пл. 762,0 кв. м. Год постройки – 1994 | | | |
| | Здание – артскважина, инв. № 640/С-27993. Назначение – здание специализированное иного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б/3. Общ. пл. 21,7 кв. м. Год постройки – 1995 | | | |
| | Сооружение – водонапорная башня, инв. № 640/С-113484. Назначение – 3 09 00 – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б/2. Общ. пл. 6,6 кв. м. Год постройки – 1996 | | | |
| | Сооружение – внутриплощадочные сети водопровода, инв. № 640/С-113745. Назначение – 3 09 00 – Сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б. Общ. пр. 110,4 м. п. Год постройки – 1991 | | | |
| | Сооружение – площадка асфальтобетонная, инв. № 640/С-113744. Назначение – 3 99 99 – сооружение нустановленного назначения. Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б. Общ. пл. 5862,0 кв. м. Год постройки – 1991 | | | |
| | Вышеуказанные здания и сооружения расположены на земельном участке площадью 2,3869 га с кадастровым номером 624650100001009734, расположенном по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б. Целевое назначение земельного участка: для строительства и обслуживания зданий и сооружений производственного цеха. Право аренды | | | |

УСЛОВИЯ

**Аукцион состоится 01.04.2024 г. в 13.00 по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б, каб. 1.**

Заявления на участие в аукционе и прилагаемые документы принимаются с 18.03.2024 г. по **31.03.2024 г.** в рабочие дни с 8.30 до 16.00 по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б, каб. 1.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Продавец: ОАО «Гуртпромстрой».

Организатор аукциона: Ликвидатор ОАО «Гуртпромстрой». Месторасположение имущества: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 230Б.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней с даты проведения аукциона.

Задаток перечисляется на р/с BY23BAPB30123467000100000000, код BABBY2X в ОАО «Белагропромбанк», г. Слуцк УНП 600154463. Получатель – ОАО «Гуртпромстрой». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № лота, дата аукциона). Задаток перечисляется в размере, указанном в настоящем извещении не позднее указанного в извещении срока окончания приема документов на участие в аукционе. Участникам, не признанными победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Победителем признается участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других участников. В случае если аукцион признан несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов. Результаты аукциона оглашаются публично в день проведения.

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, представляются следующие документы:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством);

юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;.

представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

Ознакомиться с объектом аукциона можно в дни приема документов на участие в аукционе у организатора аукциона. Контактное лицо для осмотра объектов, тел.: (029) 165 06 51, (029) 262 85 08.

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу филиал «Центральный рынок»

**Аукцион состоится 11.04.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-7508 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин) общей площадью 956,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129622 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть) протяженностью 24,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, тепловая сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129623 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 57,6 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129625 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 190,3 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129624 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 159,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129627 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 26,8 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55;<br>- сеть энергоснабжения<br>- оборудование: вагончик строительный, комплект регулирования температуры, набор мебели, насос «Грундфос УРС24*40», охранно-пожарная сигнализация, павильон из металлоконструкций, регулятор распределения тепловой энергии, регулятор расхода теплоэнергии «МИР 9701», система видеонаблюдения, система пожарной сигнализации; теплосчетчик ТЭМ-104 Ду-15; торговое оборудование (стеллаж, стол для торговли); торговый павильон (5 шт.); торговый павильон 3,2 м (2 торговых места 1,6*1,6); кондиционер настенный (2 шт.); лифт грузовой; пожарная сигнализация; холодильная камера GOLD; холодильная камера-склад.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000002000488 площадью 0,8688 га (назначение – эксплуатация и обслуживание Грандичского рынка), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55.<br>Лот 1 имеет обременения со стороны третьих лиц в виде аренды с собственниками павильонов и мест для торговли; прохождение по территории рынка теплотрассы к зданию ООО «Фирма Мока», на которой расположены павильоны и роллеты, в том числе находящиеся в собственности арендаторов |
| **Начальная цена продажи** | 1 004 331,00 руб.<br>(один миллион четыре тысячи триста тридцать один рубль) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 100 433 руб. (сто тысяч четыреста тридцать три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001<br>в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»<br>по Гродненской области,<br>код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:<br>г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208,<br>с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг)<br>и с 8.30 до 16.30 (пятница).<br>Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 09.04.2024 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.12.2022 г. | |
